

КАЛІ ТАТА — КІРОЎЦА

Сямейная газета



ХУДЗЕЦЬ ТРЭБА З РАДАСЦЮ

Сямейная газета


Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

14 МАЯ 2020 г. ЧАЦВЕР № 92 (29206)


# Кветкавая работа



Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Наталля БЕЛАВУСАВА працуе загадчыцай лабараторыі інтрадукцыі і селекцыі арнаментальных і дэкаратыўных раслін у сталічным Батанічным садзе, куды прыйшла пасля біяфака БДУ, амаль 18 гадоў. Наталля Леанідаўна прызнаецца, што на іншым месцы сябе не ўяўляе. Яно і не дзіва: працуе ж яна, паглядзіце, з якой прыгажосцю!

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей КАЗАКЕВІЧ, генеральны дырэктар РУП «Кіруючая кампанія холдынга «Белфармпрам»:**

*«За студзень—сакавік мы рэалізавалі на экспарт лекавых сродкаў больш чым на $35 млн. У той жа час з улікам павялічанай запатрабаванасці ўнутры краіны шэраг прэпаратаў, раней выраблены на экспарт, пераарыентавалі на ўнутраны рынак і рэалізуем у экспартнай упакоўцы. Падкрэслю: перш за ўсё мы павінны максімальна забяспечыць патрэбы айчыннай аховы здароўя. Фармацэўтычная прамысловасць у нас развіваецца не адзін дзясятак гадоў, па многіх пазіцыях мы забяспечваем краіну ў поўным аб'ёме самастойна».*

## КОРАТКА

- **Культурнай сталіцай Беларусі ў 2021 годзе стане Барысаў.**
- Нацбанк прагназуе інфляцыю па выніках 2020 года ў межах 5-6 %.
- **Накіроўваць дзяцей на аздараўленне ў стацыянарных летніх прапануецца не раней за 15 чэрвеня.**
- Фестываль нацыянальных культур у Гродне перанесены.
- **Беларуская чыгунка да 15 чэрвеня падоўжыла дзеянне схемы рассаджвання ў вагонах з улікам сацыяльнай дыстанцыі.**
- У Гродне ўключаць ацяпленне ў медустановах і дзіцячых садках.
- **Беларускія банкі разгледзелі каля трох тысяч зваротаў па крэдытных канікулы.**


ISSN 1990 - 763X


Фінансавая палітыка

# Стаўка рэфінансавання з 20 мая зніжаецца

### З гэтага дня яна будзе складаць восем працэнтаў гадавых

**Як адзначыў на анлайн-відэабрыфінгу старшыня праўлення Нацыянальнага банка Павел КАЛАЎР, рашэнне аб зніжэнні стаўкі рэфінансавання з 8,75 % да 8 % гадавых было прынята праўленнем Нацбанка Беларусі па выніках пасяджэння па грашова-крэдытнай палітыцы ў сераду. Акрамя таго, стаўка па крэдыце авернайт апусціцца з 9,75 % да 9 % гадавых, стаўка па дэпазіце авернайт — з 7,75 % да 7 % гадавых.**

Як адзначыў кіраўнік Нацбанка, такое рашэнне грунтуецца на абноўленым прагнозе развіцця эканомікі і грашова-крэдытнай сферы да канца 2020 года і на 2021 год. У ім улічана істотнае змяненне сітуацыі ў свеце і ў Беларусі, якое адбылося ў апошні час.

Сярод ключавых вынікаў новага прагнозу Павел Калаўр адзначыў наступнае. Па-першае, бягучае паскарэнне інфляцыі з'яўляецца часовым. Ужо ў бліжэйшыя месяцы ўзмоцніцца дэзынфляцыйны ўплыў з боку сукупнага попыту, у выніку чаго інтэнсіўнасць росту цэн замарудзіцца да ўзроўню, які назіраўся ў канцы мінулага года.

Такое змяненне балансу паміж кароткачасовымі праінфляцыйнымі і працяглымі дэзынфляцыйнымі фактарамі дае магчымасць большага змякчэння манетарнай палітыкі без пагрозы для забеспячэння цэнавай стабільнасці ў сярэднетэрміновым перыядзе.

Варта адзначыць, што зніжэнне стаўкі рэфінансавання стымулюе інвестыцыйную актыўнасць, пасылае сігнал рынку, што, нягледзячы на знешнія выклікі, сітуацыя ў эканоміцы стабільная. Акрамя таго, частка крэдытаў прывязаная да стаўкі рэфінансавання, і яе зніжэнне дазволіць знізіць выдаткі на выплаты па крэдытах. Больш падрабязна аб заяве кіраўніка Нацбанка чытайце ў наступным нумары газеты.

**Сяргей КУРКАЧ.**

*«Звязда» працягвае друкаваць матэрыялы ў падтрымку адкрыцця ў пасёлку Глуша Бабруйскага раёна музея, прысвечанага творчасці Алеся Адамовіча.*

Глуша Адамовіча

# Ад Хатыні да блакаднай трагедыі

**Сёлета мы адзначаем 75-ю гадавіну Перамогі над фашысцкай Германіяй, а летась споўнілася роўна 75 гадоў са зняцця блакады Ленінграда. Данііл Гранін сумесна з Алесем Адамовічам паспелі сабраць успаміны відавочцаў тых страшных ваенных дзён. Іх сумесная работа над выданнем пачалася 45 гадоў таму — у красавіку 1975 года. На пошукі, сустрэчы з відавочцамі і запіс іх успамінаў спатрэбіліся чатыры гады. Першае выданне кнігі выйшла ў 1979 годзе, потым былі другое, трэцяе з новымі фактамі, з новымі сведчаннямі. Ад гэтых гісторый стыла кроў у жылах. Але мала хто ведаў, што гэта яшчэ не ўся праўда. Наколькі гэта быў агалены нерв, стала вядома параўнальна нядаўна.**


СТАР. 13




**Алесь АДАМОВІЧ і Данііл ГРАНІН захавалі страшную праўду пра вайну.**

Ва ўрадзе

# Важна захаваць і вытворчасці, і калектывы

## Такую задачу паставіў перад выканаўчай уладай прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей РУМАС

**На пасяджэнні Савета Міністраў 12 мая ён падвёў вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі за студзень—сакавік 2020 года. Пасяджэнне прайшло ў фармаце відэаканферэнцыі, які, паводле слоў кіраўніка ўрада, вызначаны бягучай эпідэміялагічнай сітуацыяй. «Гэтая ж сітуацыя з'яўляецца адной з асноўных рызык, якія ўплываюць на эканоміку краіны», — адзначыў ён.**



Фота БелТА.

### СІТУАЦЫЯ Ў ЭКАНОМІЦЫ КІРУЕЦЦА

У першым квартале эканоміка знаходзілася пад уздзеяннем шэрагу знешнеэканамічных шокаў, напомніў Сяргей Румас. Падаткавы манеўр Расіі і адсутнасць дамоўленасці з расійскім бокам па пастаўцы нафты істотна ўскладнілі работу нафтахімічнай і транспартнай галін. Закрыццё меж краінамі-суседзямі з-за пандэміі адбілася на сферы паслуг. Зніжэнне цэн на сыравінных рынках, дэвальвацыя расійскага рубля паўплывалі на работу машынабудаўнічай галіны.

«Разам з тым сітуацыя ў эканоміцы ў студзені—сакавіку была кіраваная, — сказаў кіраўнік Савета Міністраў. — Тэмп росту ВУП за студзень—сакавік склаў 99,7 працэнта — на адзін працэнтны пункт ніжэй за план. Утрымацца практычна на ўзроўні 2019 года па ВУП удалося дзякуючы сектару інфармацыі і сувязі, будаўнічай галіне і сельскай гаспадарцы».

Гэтыя пункты росту дабаўленай вартасці трэба пастарацца захаваць на працягу ўсяго 2020 года, лічыць Сяргей Румас. Мінсельгасхарчу і Мінбудархітэктуры ён паставіў задачу «становічыя тэндэнцыі замацаваць і развіць».

### ШТО Ў РЭГІЁНАХ?

Па тэмпах росту ВУП становіча спрацавалі чатыры рэгіёны, паведаміў прэм'ер: Мінск, Брэсцкая, Гродзенская і Магілёўская вобласці. Зніжэнне валавага рэгіянальнага прадукту ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года адбылося ў Віцебскай, Гомельскай і Мінскай абласцях.

«Рэгіёнам неабходна цяпер дакладна разумець, за кошт якіх рэзерваў і пунктаў росту яны будуць выконваць сацыяльна-эканамічныя задачы ў 2020 годзе, — адзначыў кіраўнік урада. — Задача ўтрымаць эканоміку, не дапусціць прасядання па асноўных параметрах была пастаўленая кіраўніком дзяржавы перад эканамічным блокам на нарадзе 23 красавіка».

### ДАЎГІ АДДАЁМ СВОЕЧАСОВА

Што датычыцца даходаў бюджэту, то ў першым квартале з-за пагаршэння ўмоў работы нафтаперапрацоўчых заводаў, а таксама зніжэння аб'ёмаў і цэн экспарту калійных угнаенняў у бюджэт паступіла на 350 мільёнаў рублёў менш, чым запланавана.

«Пры гэтым усе сацыяльныя абавязацельствы, а таксама плацяжы ўнутраным і знешнім крэдытарам былі выкананыя своечасова і ў поўным аб'ёме», — адзначыў прэм'ер.

Дынаміка змяненняў на сусветным рынку сведчыць пра тое, што гэты год будзе дастаткова складаны з пункту гледжання магчымасцяў бюджэту фінансаваць капітальныя выдаткі, канстатаваў кіраўнік урада і папрасіў міністра фінансаў далажыць ацэнку фарміравання бюджэту і выкласці прапановы па яго кансалідацыі.

### ПАДТРЫМКА ЭКАНОМІКІ

«З улікам адзначаных шокаў урад прыняў комплекс аператыўных рашэнняў па забеспячэнні стабільнай работы эканомікі ў сувязі з эпідэміялагічнай сітуацыяй у свеце, — нагадаў Сяргей Румас. — Вырашаюцца пытанні працоўных гарантый работнікам, распрацаваны дадатковыя меры фінансавай падтрымкі прадпрыемстваў, шэраг мер па падтрымцы турыстычнай і спартыўнай галін. Разгорнута работа па іх рэалізацыі».

«Галоўнае — максімальна захаваць працаздольнасць прадпрыемстваў», — акцэнтаваў Румас. — «Там, дзе будзе зусім дрэнна, пры ўмове дастатковасці прынятых на месцах мер, дзяржава акажа пасільную дапамогу, каб максімальна захаваць працоўныя калектывы і напрацаваныя эканамічныя сувязі».

Урадам сфарміраваная рабочая група пад кіраўніцтвам першага намесніка прэм'ер-міністра Дзмітрыя Крутога, якая будзе сканцэнтравана на кропкавай, індывідуальнай падтрымцы асобных буйных прадпрыемстваў, паведаміў прэм'ер. Гэта меры «трэцяга ўзроўню».

З 24 красавіка дзейнічае Указ кіраўніка дзяржавы № 143, накіраваны на сістэмную падтрымку асобных галін эканомікі ва ўмовах запавольвання дзелавой актыўнасці.

«Я даручыў Мінэканомікі прааналізаваць, як працуе гэты ўказ на месцах. Сігналы, якія даходзяць да ўрада, сведчаць пра наяўнасць шэрагу праблем і перакосаў у вызначэнні сектараў эканомікі і канкрэтных прадпрыемстваў, якія найбольш пацярпелі ад пандэміі, — сказаў Сяргей Румас. — Як вызначыў кіраўнік дзяржавы — гэта сфера адказнасці кіраўнікоў рэгіёнаў».

Ён папрасіў міністра эканомікі далажыць, як на месцах разгорнутая работа па рэалізацыі Указа № 143, якія ёсць праблемы і што прапануецца зрабіць для іх вырашэння.

«Кіраўнік дзяржавы пагадзіўся з прапановай павялічыць на 1 мільярд 200 мільёнаў рублёў ліміт выдачы гарантый урада і мясцовых органаў улады для падтрымкі прадпрыемстваў, — праінфармаваў удзельнікаў пасяджэння Сяргей Румас. — Гэтым інструментам трэба вельмі разумна распарадзіцца. Створаная рабочая група прааналізуе найбольш пацярпелыя прадпрыемствы і з улікам прынятых імі самімі антыкрызісных мер вызначыць меры іх падтрымкі».

Аналагічную работу ў сціслыя тэрміны рэгіёны павінны правесці ў сябе.

«Вельмі важна дапамагчы прадпрыемствам захаваць вытворчасць і працоўныя калектывы», — паўтарыў прэм'ер.

Яшчэ адна праблема ў полі зроку ўрада — рэгуляванне цэн. Прэм'ер-міністр папрасіў МАРГ трымаць на штодзённым кантролі маніторынг выканання ведамасных пастановы № 30 «Аб рэгуляванні цэн на сацыяльна значныя тавары».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Выбары-2020

# Ад арганізацый і грамадзян

## Цэнтральная камісія па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў стварыла пазабюджэтны фонд

**У адпаведнасці з Выбарчым кодэксам Беларусі, ЦВК стварыла пазабюджэтны фонд, які фарміруецца за кошт добраахвотнага пералічэння ў яго грашовых сродкаў арганізацый, грамадскіх аб'яднанняў і грамадзян Рэспублікі Беларусь. Такая інфармацыя месціцца на сайце камісіі.**

Сродкі пазабюджэтнага фонду будуць выкарыстаны на аплату дадатковых расходаў, звязаных з правядзеннем выбараў Прэзідэнта: выраб дадатковага накладу інфармацыйных матэрыялаў аб кандыдатах, плакатаў з датай выбараў, матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне тэрытарыяльных і ўчастковых камісій па выбарах, а таксама на аплату іншых выдаткаў, непасрэдна звязаных з выбарчай кампаніяй.

Уносіць грашовыя сродкі ў пазабюджэтны фонд могуць арганізацыі, грамадскія аб'яднанні ў безнаяўным парадку шляхам пералічэння грашовых сродкаў са свайго разліковага рахунку на бягучы (разліковы) банкаўскі рахунак Цэнтральнай камісіі; грамадзяне Беларусі шляхам унясення наяўных грашовых сродкаў у касы банкаў, а таксама шляхам пералічэння грашовых сродкаў з рахунку грамадзяніна, у тым ліку з выкарыстаннем банкаўскай плацежнай карткі, з наступным залічэннем іх на бягучы (разліковы) банкаўскі рахунак Цэнтральнай камісіі. Ахвяраванне ў пазабюджэтны фонд Цэнтральнай камісіі грамадзянін можа ажыццявіць з дапамогай сістэмы дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання «Інтэрнэт-банкінг».

Права размеркавання і выкарыстання грашовых сродкаў пазабюджэтнага фонду належыць Цэнтральнай камісіі. Яна пры неабходнасці мае права прыняць рашэнне аб размеркаванні грашовых сродкаў пазабюджэтнага фонду паміж тэрытарыяльнымі і ўчастковымі камісіямі па выбарах Прэзідэнта Беларусі для іх дадатковага матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння, а таксама аплаты іншых расходаў, непасрэдна звязаных з правядзеннем выбарчай кампаніі.

Нявыкарыстаныя рэшткі грашовых сродкаў пазабюджэтнага фонду ў пяцідзённы тэрмін пасля складання зводнай справаздачы пералічваюцца фінансавым органам адпаведнага выканаўчага камітэта, адміністрацыі.

Такія грашовыя сродкі могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы і правядзенні наступных выбараў і рэспубліканскіх рэферэндумаў у парадку, устаноўленым Цэнтральнай камісіяй.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Блізкая ўлада

# На месцах трэба рэагаваць больш аператыўна

**Памочнік Прэзідэнта — інспектар па Віцебскай вобласці Анатоль ЛІНЕВІЧ правёў прамую тэлефонную лінію ў Віцебскім аблвыканкаме, да яго звярнуліся больш за трыццаць чалавек.**

Жыхарка Оршы паскардзілася на тое, што ў ванным пакоі гарачая вада перыядычна ў дэфіцыце, у адрозненне ад кухні, дзе такой праблемы няма. Анатоль Лінеvіч даручыў абласной ЖКГ разабрацца як мага хутчэй.

Мужчына, які жыве ў Віцебску на праспекце Перамогі, паведаміў пра вільготнасць і цвіль у кватэры. Яго дзеці часта хварэюць з-за гэтага. Памочнік Прэзідэнта даручыў вывучыць сігнал.

Бадай, нестандартнае пытанне задаў нават вяспечаны жыхар абласнога цэнтра. Жыве ён у былой вёсцы Васюты, тэрыторыю якой далучылі да Віцебска. Жыхары, а там каля пяцідзесяці дамоў, мараць пра цэнтралізаванае водазабеспячэнне... Атрымліваецца, з аднаго боку — гараджане, і хочацца жыць «цывілізавана», а з другога боку — нічога не змянілася ў населеным пункце. Мужчыну падрыхтуюць адказ, як будзе вырашацца праблема.

З вёскі Стары Лепель Лепельскага раёна папрасілі вырашыць праблему з вадой. Жанчына паскардзілася, што ў цёплы час года ў калодзежах вада становіцца непрыдатная для ўжывання. Людзі просяць, каб ўстанавілі калонкі. Што датычыцца магчымасці цэнтралізаванай падачы вады, то заяўніца расказала, што ім ужо прапаноўвалі зрабіць гэта за ўласныя сродкі. Але варыянт вельмі дарагі — як для яе, так і для суседзяў. Адказныя асобы падкажуць, які можна знайсці выхад пры мінімуме выдаткаў.

Віцьблянка ў вельмі паважаным узросце падзялілася сваёй крыўдай. У салоне аднаго з аператараў мабільных паслуг яна ў свой час купіла планшэт і выходзіла з яго ў «сусветнае павуціннe». Потым стала карыстацца інтэрнэтам ад РУП «Белтэлекам». Але, не ведаючы юрыдычных нюансаў, напэўна, не скасавала дамову і запазычылася мабільнай кампаніі 20 рублёў. Сцвярджае, што ў офісы аплаціла гэтую суму. Але неўзабаве высветлілася, што неабходна плаціць яшчэ. У прыватнасці, з карткі знялі 9 рублёў — з пенсіі. Чаму так здарылася, навошта плаціць за тое, чым не карыстаешся, няўжо ў 70 гадоў трэба нешта даказваць, калі больш не хочаш атрымліваць паслугу? — так разважала падчас размовы пенсіянерка. У адказ пачула абяцанне ўважліва разабрацца. Канешне, з аднаго боку, трэба заўсёды ўважліва чытаць дамову, але калі пачалавечы: ну можна ж пайсці бабулі насустрач!

Каментуючы журналістам тэлефонную лінію, Анатоль Лінеvіч адзначыў, што па магчымасці трэба пастарацца знайсці рашэнне, але згодна з заканадаўствам. Што датычыцца паўторных зваротаў, дык лепш яшчэ раз праправерыць, ці мае чалавек рацыю. Гэта адносіцца і да «вечнай тэмы» — праблем ЖКГ. Памочнік Прэзідэнта ўпэўнены: трэба на месцах рэагаваць больш аператыўна і задавальняць заяўкі грамадзян.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**


**ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении публичных торгов
в форме аукциона по продаже имущества
дирекции строящегося
государственного предприятия
«Завод глиняного кирпича»**

**1. Дата и время проведения: 22.06.2020, 11.00**
**2. Прием заявлений участников на участие в торгах будет осуществляться с 09.00 17.05.2020 до 16.00 19.06.2020**

| № лота | Наименование | Начальная цена, руб. | Шаг аукциона, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Склад с инв. № 235/С-9641; общая площадь 1388,5 кв. м; расположено на земельном участке с кадастровым № 225183012101000094 | 77520,00 | 3876,00 | 3876,00 |
| 2 | Открытая складская площадка с инв. № 235/С-9642; общая площадь 5360,1 кв. м; расположено на земельном участке с кадастровым № 225183012101000094 | 46800,00 | 2340,00 | 2340,00 |

**3.** Продавец: Дирекция строящегося государственного предприятия «Завод глиняного кирпича», тел. +375291070012.

**4.** Организатор торгов: ООО «Консалтингово-инжиниринговая компания «Правильные Инвестиции», г. Минск, ул. Я. Коласа, 73, комн. 8, тел. +375445959015.

**5.** Место проведения: г. Минск, ул. Мясникова, 39 комн. 331.

**6.** Место нахождения предмета торгов: Витебская обл., Чашникский р-н, Лукомльский с/с, 13, восточнее д. Богатырь.

**7.** Лицо, желающее участвовать в торгах, обязано подать организатору торгов в указанный в извещении срок заявление на участие в торгах, документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 10 рабочих дней со дня их проведения.

**8.** Ознакомиться с предметами торгов и условиями проведения аукциона можно по месту нахождения, предварительно согласовав дату и время с представителем продавца по тел. +375291070012.

**9.** По результатам торгов организатором торгов составляется протокол, подписываемый всеми участниками аукциона.

**10.** С победителем торгов продавцом в срок не позднее 35 рабочих дней от даты подписания протокола о результатах торгов заключается договор купли-продажи. Приобретенный предмет торгов оплачивается участником, выигравшим торги не позднее 5 рабочих дней от даты заключения договора купли-продажи. Кроме стоимости предмета торгов победителем аукциона оплачиваются расходы по организации торгов.

**11.** В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником, либо для участия в них явился только один участник, предмет торгов может быть подан этому участнику по цене, превышающей начальную, на 5 %.

УНП 192344131

На слыху

# Гуманітарны груз з Кітая прыбыў у Беларусь

## Ён даставіў лінію па вытворчасці рэспіратараў

**У Беларусі на 13 мая зарэгістравана 25 825 чалавек са станоўчым тэстам на COVID-19, паведамляе Міністэрства аховы здароўя. З іх 7711 пацыентаў паправіліся і выпісаны, з пачатку ўспышкі не ўдалося выратаваць 146 чалавек. За гэты час у краіне праведзена 296 380 тэстаў.**

Учора на аэрадром Мачулішчы прыбыў чарговы самалёт з гуманітарным грузам з Кітая. Рэйс даставіў у Беларусь закупленую ў Кітаі лінію па вытворчасці рэспіратараў KN95. Дзякуючы гэтаму ў нашай краіне будзе наладжана ўласная вытворчасць, якая забяспечыць патрэбу насельніцтва ў плоскіх масках, а таксама ў рэспіратарах 2-га і 3-га узроўняў аховы.

У самалёце таксама сродкі медыцынскага прызначэння, закупленыя беларускімі кампаніямі па запыце Міністэрства аховы здароўя. Гэта апараты штучнай вентыляцыі лёгкіх, тэст-сістэмы, ахоўныя сродкі. Вага грузу — больш за 10 тон.

Як адзначылі ў пасольстве Беларусі ў КНР, за сакавік—май гэтага года з Кітая ў Беларусь было накіравана больш за 90 тон розных сродкаў медыцынскага прызначэння, у тым ліку дапамога ад урада КНР, рэгіёнаў і суб'ектаў гаспадарання, а таксама закупленыя беларускімі кампаніямі медыцынскія вырабы. Цяперашні груз сфарміраваны гарадамі і правінцыямі КНР — Пекінам, Чанчунем, Сіньцзян-Уйгурскай аўтаномнай акругай. Па-ранейшаму актыўна дапамагаюць кітайскія кампаніі, якія ўзаемадзейнічаюць з нашай краінай у розных сферах.

Далучылася да дапамогі і беларуска-аўстрыйская кампанія «Райфайзен-Лізінг». Яна прафінансавала закупку пяці тысяч тэставых сістэм на вызначэнне антыцел да COVID-19. Іх будуць выкарыстоўваць для дыягностыкі пацыентаў з каранавірусам у Мінску і іншых гарадах.

Тэставыя сістэмы прызначаны для Рэспубліканскага цэнтра арганізацыі медыцынскага рэагавання Міністэрства аховы здароўя. Плануецца, што спецыялісты цэнтра размяркуюць іх па бальніцах. У першую чаргу сістэмы будуць выкарыстоўваць пры вызначэнні каранавіруса сярод пацыентаў, якія паступаюць у стацыянары. Гэта высокадакладныя тэсты на антыцелы да COVID-19.

— Такое тэсціраванне праводзіцца для хуткай дыягностыкі пацыентаў, якія заразіліся каранавірусам ці ўжо перахварэлі на яго. Гэта дапамога беларускім медыкам у іх няпростай барацьбе з пандэміяй. Як частка групы Raiffeisen мы бяром да ўвагі і вопыт Аўстрыі, якая дзякуючы шырокаму тэсціраванню здолела адна з першых у Еўропе перааддолець пік эпідэміі. Многае для гэтага робіцца і ў Беларусі, і мы палічылі важным зрабіць свой унёсак, — растлумачылі ў «Рафайзен-Лізінг».

**Алена КРАВЕЦ.**

Рука дапамогі

# «Добрыя атрады»: патэлефануй на «201»




**МТС далучыўся да ініцыятывы Беларускага Чырвонага Крыжа і арганізаваў «Добрыя атрады»: 900 валанцёраў ва ўсіх рэгіёнах краіны будуць дапамагаць пажылым людзям з дастаўкай прадуктаў, прадметаў першай неабходнасці і лекаў. Яны пройдуць спецыяльную падрыхтоўку, кожны атрымае адметную экіпіроўку і неабходныя сродкі аховы: аднаразовыя пальчаткі, медыцынскія маскі, антысептык.**

Як пакінуць заяўку, можна даведацца на інфалініі Беларускага Чырвонага Крыжа — «Добры тэлефон 201».

«Мы рады, што так шмат неабыякавых людзей знаходзяць час, каб дапамагчы іншым. Цяпер як ніколі важна ізаляваць пажылых грамадзян ад лішніх сацыяльных кантактаў — так мы зможам скараціць колькасць інфіцыраваных і такім чынам знізім нагрузку на ўстановы аховы здароўя. А людзі старэйшага ўзросту пры гэтым захаваюць здароўе і не будуць адчуваць сябе самотна», — адзначыла **нацыянальны каардынатар валанцёраў COVID-19 Беларускага Таварыства Чырвонага Крыжа Алена РУСІНОВІЧ.**

«Добры тэлефон» у падтрымку пажылых людзей, арганізаваны Беларускім Таварыствам Чырвонага Крыжа і платформай «Імёны», пачаў працаваць 30 сакавіка. Звярнуцца на інфалінію можна ў будні — з 9 да 18 гадзін. Да ініцыятывы далучыліся мабільныя аператары краіны і абнулілі тарыфікацыю званкоў на нумар 201. Для абанентаў МТС яны будуць бясплатныя да канца года. Для званкоў са стацыянарных тэлефонаў даступны нумар 122.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Прэзідэнт Афганістана загадаў перайсці ў наступленне на тэрарыстаў



Ашраф Гані аддаў сілавым ведамствам краіны загад перайсці да наступальных дзеянняў супраць тэрарыстаў. Як перадаў афганскі тэлеканал Tolo News, адпаведную заяву ён зрабіў у звароце да нацыі пасля ажыццёўленых раней экстрэмістамі нападаў у Кабуле і правінцыі Нангархар, у выніку якіх загінулі і атрымалі раненні дзясяткі людзей. Як заўважыў Гані, радыкальны рух «Талібан» «ігнаруе неаднаразовыя заклікі афганскіх улад да скарачэння маштабаў гвалту і спынення агню». Па словах прэзідэнта, заклікі спыніць вайну «не азначаюць слабасць, а дэманструюць прыхільнасць да міру». Ваенныя фарміраванні «Талібана» гатовыя да дзеянняў у адказ супраць сілавых падраздзяленняў Афганістана, адзначаецца ў заяве прадстаўніка руху Забіхулы Муджахіда. Ён таксама дадаў, што «Талібан» рашуча асуджае атакі, учыненыя напярэдадні тэрарыстамі «Ісламскай дзяржавы», і нагадаў, што рух праводзіў мноства аперацый супраць ІД.

## Еўра слабее адносна долара



На фоне глабальнай пандэміі і няздольнасці краін Еўропы згуртавацца перад агульнай пагрозай самай уразлівай валютай у краінах з развітай эканомікай становіцца еўра. Пра гэта паведаміў Bloomberg. З пачатку года еўра ўпаў на 3,5 працэнта ў адносінах да долара. Удзельнікі рынка ўпэўнены, што з часам валюта працягне аслабляцца. У разгар эпідэміі краіны ЕС усё яшчэ не могуць выпрацаваць адзіную фіскальную палітыку для падтрымкі эканомікі. Што датычыцца найбольш устойлівых валют у перыяд пандэміі, то імі аказаліся нацвалюты Аўстраліі, Новай Зеландыі і Паўднёвай Карэі. Гэтым краінам удалося лепш за астатніх справіцца з успышкай каранавіруса. Цяпер інвестары актыўна ўкладваюцца ў акцыі і аблігацыі мясцовых эмітэнтаў, якія выпускаюцца ў аўстралійскіх і новазеландскіх доларах і карэйскіх вонах.

## Дональд Трамп дапамог Ілану Маску адкрыць фабрыку



Перш чым адкрыта парушаць законы акругі Аламіда ў штаце Каліфорнія і адкрываць завод насуперак патрабаванням мясцовых улад, генеральны дырэктар Tesla Ілан Маск заручыўся падтрымкай прэзідэнта ЗША Дональда Трампа. Пра гэта паведаміла газета Washington Post. Аказалася, што Маск і Трамп стэлефаноўваліся ў красавіку. У ходзе званка мільярдэр пераконваў амерыканскага лідара, што аднаўленне вытворчасці на заводах Tesla не ўяўляе ніякай рызыкі. Маск паведаміў пра тое, што хоча вярнуцца да работы 1 мая ці раней, калі гэта магчыма. Як вядома, амерыканскі прэзідэнт заявіў аб тым, што «згодны на 100 працэнтаў», што фабрыкі Tesla павінны быць адкрытыя. У сваім Twitter-акаўнце Маск звярнуўся да мясцовых улад з заявай, што яны могуць прыйсці і арыштаваць яго, калі захочуць. Тым часам улады Аламіды накіравалі кіраўніцтву Tesla ліст, у якім заклікаюць спыніць вытворчасць і вярнуць супрацоўнікаў па дамах на самаізаляцыю. Пакольські Маск праігнараваў пасланне, чакаецца, што ў найбліжэйшы час супраць яго могуць распачаць больш рашучыя меры. Аднак невядома, ці змогуць мясцовыя ўлады праявіць настойлівасць, калі ўлічыць, што ў Tesla з'явіўся такі магутны саюзнік.

# Медыкі, якія змагаюцца з COVID-19, могуць не плаціць натарыусам

**Рашэнне аб вызваленні ад уплаты натарыяльнага тарыфу асобных работнікаў аховы здароўя прынята Беларускай натарыяльнай палатай (БНП) з мэтай падтрымаць такім чынам медыкаў, якія змагаюцца з каранавірусам.**

З 11 мая да 30 чэрвеня ўрачы, кіроўцы машын хуткай дапамогі, санітаркі, работнікі лабараторый, якія даследуюць пробы на інфекцыю, выкліканую COVID-19, медработнікі, якія аказваюць дапамогу пацыентам з вірусам і асобам, якія аднесены да кантактаў першага ўзроўню, або працуюць ва ўмовах, звязаных з інфекцыяй, вызваляюцца ад выплаты тарыфу за сведчанне сапраўднасці іх подпісаў на дакументах, засведчанне даверанасцяў, іх адмену, а таксама за аказанне паслуг прававога і тэхнічнага характару, звязаных са здзяйсненнем натарыяльных дзеянняў.

*— Мы хочам быць сапраўды карыснымі для нашых медыкаў. Вызваленне ад выплаты натарыяльнага тарыфу на такі перыяд — спроба зразумець, наколькі наша прапанова будзе запатрабавана,* — расказала **Наталля БАРЫСЕНКА, старшыня Беларускай натарыяльнай палаты.** — *Мы разумеем, што час напружаны і не ўсе, каму патрэбна дапамога натарыуса, змогуць дайсці да нас да ліпеня. Таму мы не выключаем, што можам працягнуць час дзеяння нашай прапановы або ўключыць у пералік медработнікаў асоб, на якіх мы маглі забыцца, прымаючы рашэнне.*

Каб атрымаць бясплатную дапамогу, работнікам аховы здароўя неабходна мець пры сабе даведку з месца работы з указаннем у ёй дадатковай інфармацыі, што чалавек аказвае медыцынскую дапамогу пацыентам з каранавірусам або асобам, якія адносяцца да кантактаў першага ўзроўню, ці працуе ва ўмовах, якія звязаны з інфекцыяй. Яны могуць звярнуцца па тэлефоне ў любую натарыяльную кантору ці бюро па ўсёй краіне для папярэдняга запісу і ўзгадніць найбольш зручную дату і час прыёму для здзяйснення натарыяльнага дзеяння. Можна таксама атрымаць і кансультацыю па тэлефоне або праз месенджар.

*— Для нас гэта прадуманы крок, бо палата знаходзіцца на самафінансаванні і мы лічым усе нашы даходы і расходы. Вырашыўшыся на такую дапамогу, мы хочам не проста задэклараваць яе, а зрабіць запатрабаванай. Калі ў будучым медыкі звернуцца па нейкім пытанні, якое мы не абазначылі ў дакументце, мы абавязкова дапаможам ім індывідуальна,* — дадала старшыня БНП.

**Ірына СІДАРОК.**

А не шкодзь!

# Браканьеры білі рыбу токам

**Рэйдавая група Мядзельскай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету працавала на возеры Баторына. Інспектары правяралі, ці не ўстаноўлены ў вадзе браканьерскія сеткі. Адзін з іх пачуў напярэдзе трэск трыснягу і неўзабаве дагнаў мужчыну, які лавіў рыбу з дапамогай электравуды.**

Сваю прыладу браканьер вырабіў з выдумкай: электрапровад з аголеным канцом і пераключальнік току былі прыматаны да восцяў, невялікі акумулятар парушальнік замацаваў на поясе, а ўлоў насіў за сабой у садку. Паляваў браканьер у асноўным на вугроў. Гэтая рыба хоць і не нерастуе ў нашых шыротах, але якраз у гэты час актыўна мігруе. За дзесяць вугроў (лавіць іх рыбакам-аматарам забаронена, а тым больш з дапамогай электравуды)



давядзецца пакрыць 40,5 тысячы рублёў. Была ў садку затрыманага і іншая рыба — чатыры ліні і шчупак, якіх ацанілі ў 5,5 тысячы рублёў.

Як паведамілі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, негатыўны вопыт падобнай рыбалкі мужчына ўжо меў: у 2015 годзе яго судзілі за незаконную здабычу вугра і нават на паўтара года пазбавілі волі. Цяпер у дачыненні да 46-гадовага жыхара Мядзела зноў распачата крымінальная справа, яго ўзялі пад варту.

На наступны дзень на возеры Белым інспектары заўважылі яшчэ двух браканьераў з электравудамі, якія ішлі ўздоўж берага і перыядычна апускалі ў ваду прылады. Аднаго з парушальнікаў удалося затрымаць. Пад карчом пазней выявілі здабычу браканьераў — пяць вялізных сазанаў агульнай вагой каля 26 кілаграмаў.

Па факце незаконнага рыбалоўства на возеры Белым праводзіцца праверка, асоба змоўшчыка, які ўцёк, устаноўлена. Прычыненая браканьерамі шкода склала 6,5 тысячы рублёў.

Электралавільныя прылады і рыбу адправілі на экспертызу, каб даказаць, што лоўля адбывалася менавіта з выкарыстаннем электратоку. Гэта цягне прымяненне пяціразовага павышаючага каэфіцыента пры разліку прычыненай шкоды.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Рух ад сэрца

# Песні пра чалавечнасць

**56 800 беларускіх рублёў паступіла на дабрачынны рахунак 10-й гарадской клінічнай бальніцы Мінска падчас трэцяга анлайн-марафону #БеларусьБезCovid. Напярэдадні Вялікай Перамогі каманда прадзюсарскага цэнтра «Спамаш» зноў злучыла праз асабістую сустрэчу і анлайн-сувязь папулярных артыстаў, спартсменаў і медыйных асоб з Беларусі і іншых краін свету, каб падтрымаць медыцынскіх работнікаў.**

Удзельнікамі шматгадзіннага канцэрта ў прамым эфіры сталі тэнісісты Арына Сабаленка і Ягор Герасімаў, а таксама алімпійскі чэмпіён Максім Мірны (ён зараз у ЗША), спевакі Пётр Елфімаў, TAKAYA (Украіна), Томас N`evergreen (Данія), In-Grid (Італія), мастак і дызайнер Уладзімір Цэслер, заслужаныя артысткі Рэспублікі Беларусь Іна Афанасьева, Ірына Дарафеева і Вікторыя Алешка, актрыса і тэлевядучая Вера Палякова, гурты NaviBand, «Харлі» і Las Vegas, Дзядзька Ваня, Ганна Шалюціна, Ілья Міцько, салісты цэнтра Іван Здановіч і Ксенія Галецкая, Хелена Мераai ды многія іншыя артысты, а таксама самі ўрачы 10-й сталічнай бальніцы.

Усе сродкі, якія ўдалося сабраць падчас анлайн-марафону, будуць выкарыстаны для набыцця неабходных сродкаў аховы, прэпаратаў і абсталявання, што выкарыстоўваюцца ў барацьбе з каранавіруснай інфекцыяй. Акрамя таго, сумесна з РНПЦ трансфузіялогіі і медыцынскіх тэхналогій арганізатары дабрачыннай акцыі абвясцілі збор даных донараў плазмы для лячэння хворых на COVID-19 — такіх «анёлаў-дарыцеляў», якія дапамогуць выратаваць жыцці іншых людзей, чакаюць па ўсёй краіне.

— Гэта той выпадак, калі дапамога не бывае малой ці вялікай, — перакананая **дырэктар прадзюсарскага цэнтра Анжэліна МІКУЛЬСКАЯ,** — кожная кропля ў моры важная, таму мы вельмі ўдзячныя ўсім і кожнаму: і арганізацыям, і канкрэтным людзям, якія ўдзельнічаюць у праекце і ахвяруюць на дабрачынны збор для бальніц хто колькі можа. Мы бачым падчас гэтых марафонаў, якія сціплыя нашы беларускія медыкі, як яны пасярод неверагоднай стомленасці і напружанай працы часам забываюцца на сябе, дапамагаючы іншым, — а таму асабліва востра рэагуюць на ўвагу да сябе, маральную падтрымку, шчыра радуюцца і бясконца дзякуюць артыстам. І таму, сваю чаргу, наша каманда радуецца, калі бачыць, што наш унёсак патрэбны, што за сабраныя грошы ўжо набытая пэўная частка неабходнага абсталявання... Мне здаецца, цяперашняя агульная бяда дазволіла раскрыць у кожным момант чалавечнасці, чуласці і гатоўнасці дапамагчы, і гэта, мабыць, самае каштоўнае, тое, што наблізіла людзей ва ўсім свеце да выздараўлення. Усе разам — мы абавязкова пераможам хваробу.

Нагадаем, раней прадзюсарскі цэнтр «Спамаш» правёў два анлайн-марафоны, дзякуючы якім была аказана адрасная дапамога мінскай гарадской клінічнай бальніцы № 3 імя Я. Клумава, а таксама Віцебскай абласной бальніцы. Прамыя трансляцыі ўсіх трох марафонаў на інтэрнэт-пляцоўках паглядзела звыш 300 тысяч чалавек.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# Май на Першамайскай

**Вуліца Першамайская ёсць у большасці нашых гарадоў і вёсак. Тлумачыца гэта не толькі мілагучнасцю назвы. Усе мы, выбіраючы гэтую лакацыю для свайго жытла, падсвядома імкнёмся знаходзіцца на жыццядайным шляху вясны, аднаўлення. Я прайшоўся з фотаапаратам па мінскай вуліцы, якая мае назву Першамайская. Сустрэў шмат знаёмых. Разам абмеркавалі новы бігборд. Палюбаваліся, як мужчына ў касцюме «Гаркамунгаса» палівае вадою расквечаныя маладой лістотаю кусты. Гэтыя фота і вершаваны роздум над імі я занёс у свой дзённік.**






Яўгена ПЯСЕЦКАГА
Фота слова

*Збіраем дні,*
*як з-пад сярпа калоссе,*
*Шукаючы зярняткі мудрых слоў.*
*Але каму, скажыце, давялося*
*Пачуць у тым*
*спрадвечным шматгалоссі*
*Хоць колькі новых*
*для сябе высноў?*
*Мы, ўладары*
*блакітнае планеты,*
*Прыцішваем і паскараем час...*
*Але усё ж, нягледзячы на гэта,*
*Жыццё дыктуе тыя ж запаветы*
*І той жа самы наш прад ім адказ.*

Разумныя грошы

# Інтэрнэт-банкінг для пажылой мамы і не толькі

**Як пазбегнуць наведвання аддзялення банка старымі бацькамі? Як зберагчы іх ад лятаючага віруса? Што рабіць, калі неабходна здзейсніць тую ці іншую фінансавую аперацыю, а на кожным кроку раяць пазбягаць месцаў масавага збору людзей.**

Ёсць простае рашэнне. Вы можаце здзяйсняць дыстанцыйна ўсе неабходныя плацяжы: аплату камунальных паслуг, інтэрнэту, тэлефона, перавод грошай з карткі на картку і нават афармленне банкаўскага прадукту — адкрыццё дэпазіту або куплю бездакументарных аблігацый. Так, усё новае складанае, але не трэба яго баяцца, і ўсё атрымаецца, — менавіта гэта трэба тлумачыць вашым немаладым, але самастойным сваякам.

## Запомніць лагін і пароль

Цяпер ва ўсіх без выключэння ёсць банкаўская картка. Як правіла, у выпадках з пенсіянерамі, гэта «пластык» Беларусбанка. З дапамогай карткі можна амаль усё аплаціць у інфакіёсках. Пры наяўнасці камп'ютара або мабільнага інтэрнэту на смартфоне ўсё гэта можна рабіць у сябе дома.

Для ўваходу ў сваю сістэму інтэрнэт-банкінгу трэба ўсё ж такі прыйсці ў сваё аддзяленне і зарэгістравацца з дапамогай супрацоўніка банка ці кагосьці з маладых сваякоў. Спецыяліст растлумачыць спецыфічныя патрабаванні да лагіна і пароля — у кожнага банка яны свае.

Гэтыя два наборы літар і лічбаў (часам упераменшку і з рознымі рэгістрамі) трэба запомніць, у крайнім выпадку запісаць у патаемным месцы. Той жа супрацоўнік выдасць вам пластыкавую картку кодаў. Пасля набору лагіна і персанальнага пароля на маніторы (або на смартфоне) высвеціцца лічба ад 1 да 40. Менавіта пад гэтым нумарам трэба шукаць на картцы адпаведны код, які складаецца ўжо з чатырох знакаў (часцей лічбаў).

Гэты самы код з карткі трэба ўводзіць дастаткова смела (то-бок хутка), бо ён дзейнічае на працягу адной хвіліны. Але пры гэтым — вельмі ўважліва: пры трохразовым напісанні няправільнай камбінацыі лічбаў сістэма банкінгу зачыніцца. Каб яе зноў адкрыць, давядзецца зноў ісці ў банк або тэлефанаваць туды і называць сакрэтнае слова. Карацей, лішні клопат.

## Перад аплатай варта падрыхтавацца

Перш чым адказаць на пытанне, як аплаціць, трэба пазначыць асноўныя звесткі, неабходныя для ажыццяўлення аплаты камунальных паслуг. Па-першае, трэба адшукаць на пяпаровай «жыроўцы» нумар плацельшчыка і асабісты рахунак абанента. Калі з нумарам плацельшчыка паўстануць праблемы, то пажадана патэлефанаваць спецыялісту па камунальных разліках — тэлефон яго прысутнічае ў «жыроўцы». Затым здабываюцца паказанні лічыльнікаў, а таксама адрас і прозвішча плацельшчыка (чалавека, на якога зарэгістравана жыллё).

Дапусцім, мы зайшлі ў праграму свайго банка і шукаем нешта накшталт пункта «Аплата паслуг» — там і будзе АРІП. З 2018 года схема наступная: выбіраем спачатку раздзел «Камунальныя плацяжы», далей падкатэгорыю ЖКП («Жыллёва-камунальныя паслугі»), потым рэгіён, а затым канкрэтную паслугу. Стоп.

Для прыкладу разбяромся з «камуналкай» для сталіцы. У выпадку з Мінскам бачым цэлыя чатыры радкі. Гэта пералік катэгорый і падкатэгорый паслуг, зарэгістраваных у АІС «Разлік». У гэтай сістэме сродкі пералічваюцца на падставе патрабаванняў да аплаты, у якіх камунальныя службы перадаюць інфармацыю па асабістых рахунках. «Гэта значыць, што адзін асабісты рахунак па камунальных плацяжах можа праходзіць па паслузе «Плацяжы праз ЦІТ (Цэнтр інфармацыйных тэхналогій Мінгарвыканкама. — **Аўт.**)», іншы — па паслузе «Камунальныя плацяжы АІС Разлік-ЖКП». Паслугі адрозніваюцца па опцыях аплаты, а таксама па атрымальніках плацяжу», — тлумачаць у кантакт-цэнтры АРІП.

Далей бачым яшчэ тры катэгорыі: «Камунальныя плацяжы АІС Разлік ЖКП», «Плацяжы ТУ (таварыства ўласнікаў. — **Аўт.**) / ЖБВК АІС Разлік-ЖКП» і «Плацеж праз ЦІТ». Выбіраем адну з першых дзвюх — і ўводзім нумар асабістага рахунка з квітанцыі. Аплата прайшла? Добра. Калі не, то выбірай другую катэгорыю. У АРІП тлумачаць, што зразумець «сваю» катэгорыю лягчэй эмпірычным шляхам. Яшчэ можна патэлефанаваць у АРІП, назваць нумар асабістага рахунку — і там адразу падкажуць шлях для аплаты.

Пры аплаце «камуналкі» ўсплываюць графы пра нейкія паказанні лічыльнікаў, прычым некаторыя ўжо будуць запоўненыя — гаворка пра ваду. У графе «Лічыльнік 1 — бягучае значэнне» ўводзім тое, што бачым на лічыльніку з халоднай вадой. Тое ж самае з другім «бягучым значэннем» — гэта вада гарачая. А наогул, куды якую лічбу ўпісаць, будзе зразумела з папярэдняга значэння: халоднай вады, як правіла, нацякае значна больш.

## Кароткі парадак аплаты камунальных паслуг у сістэме «Разлік» (АІС АРІП)

**1.** Увайсці ў інтэрнэт-банкінг «Беларусбанк».
**2.** Выбраць раздзел «Плацяжы і пераводы».
**3.** Увайсці ў АРІП (сістэма «Разлік»).
**4.** Націснуць кнопку «Новы плацеж» (або «Плацеж»).
**5.** Выбраць населены пункт (тэрытарыяльную прыналежнасць): вобласць — раён — горад (вёску) ці адразу горад.
**6.** Выбраць раздзел «Камунальныя плацяжы».
**7.** Выбраць плацежную картку (калі іх некалькі), з якой будзе ажыццёўлены плацеж.
**8.** Запоўніць усе палі.
**9.** Націснуць кнопку «Аплаціць».
**10.** Захаваць плацеж.

Дапусцім цяпер, мы забыліся пра электраэнергію. Ідзём у АРІП і пачынаем спачатку. Выбіраем «Камунальныя паслугі», потым — «Электра-, цеплазабеспячэнне», патрэбны горад (напрыклад, Мінск), затым «Мінскае МРА» — «Электраэнергія». Сюды ўводзім нумар абанента. Даведацца яго няцяжка — трэба патэлефанаваць у даведачную «Энергазбыту», назваць свой адрас і ў адказ атрымаць патрэбную камбінацыю лічбаў.

З газам гісторыя асобная. Калі ў кватэры ёсць лічыльнікі, то даводзіцца плаціць асобна. Ідзём у «Камунальныя паслугі», затым «Газазабеспячэнне», выбіраем рэгіён і «Газ» (для Мінска). Сюды ўводзім асабісты рахунак, паказаны на вашу кватэру. Калі лічыльніка няма, усё, у прынцыпе, яшчэ прасцей: плата за газ уключана ў адну «вялікую» квітанцыю. Каб аплаціць асобную квітанцыю для ТУ, у дрэве АРІПА трэба знайсці «Таварыства ўласнікаў». Далей горад (напрыклад, Мінск), раён — і выбіраем са спісу адрасоў той, дзе зарэгістравана патрэбнае ТУ.

Пры наступных аплатах лепш выкарыстоўваць раздзелы «Апошнія аплачаныя» і «Гісторыя плацяжоў». Так не давядзецца зноў выбіраць паслугі па дрэве паслуг АРІП.

Аплата хатняга тэлефона выклікае цяжкасць толькі першы раз. Трэба выбраць раздзел «Плацяжы і пераводы», затым «Тэлефанія», рэгіён, увесці нумар тэлефона па падказцы. Для аплаты сотавай сувязі трэба ўвайсці ў сістэму «Разлік», затым выбраць «Пошук паслуг», «Дрэва АРІП» і «Мабільная сувязь». Там пазначаем свайго аператара і ўпісваем свой нумар сотавага.

Як бачым, усё не так страшна і складана. Пераканацца ж у гэтым на практыцы можна, толькі паспрабаваўшы самому. Так што поспехаў!

**Сяргей КУРКАЧ.**

Сямейная газета

Выпуск № 9 (145)

# ЛЮБОЎ БЕЗ УМОЎ

*Нядаўна давялося стаць сведкам абмеркавання, удзельнікі якога, энергічныя маладыя гараджане, раліся — віртуальна — якім чынам лепш угаварыць не такіх энергічных ды не такіх маладых, а часта і не гараджан, а вяскоўцаў-бацькоў, прытрымлівацца рэкамендацый СААЗ: мінімізаваць кантакты, пазбягаць месцаў масавага знаходжання людзей, узяць на працы адпачынак за ўласны кошт і пабыць пэўны час у самаізаляцыі. Адна з жанчын расказала, як фактычна ўсёй сям'ёй угаворвалі бацьку-пенсіянера звольніцца з работы, другі хлопец расказаў, што адправіў маму з татам ізалявацца на лецішча, забяспечыў інтэрнэтам і раз на тыдзень прывозіць усе неабходныя прадукты, але бачыць, як самотна і адлучана ад жыцця адчувае сябе старэйшае пакаленне... Хтосьці з фарумчан даводзіў, што пытанне асабістай бяспекі і здароўя трэба ставіць рубам, хтосьці спрачаўся, маўляў, чаму вы пазбаўляеце бацькоў права самім вырашаць, што рабіць з уласным жыццём — помсціце за забароны ўласнага дзяцінства?*

*Падумалася, што вось так насамрэч і замыкаецца кола: спачатку бацькі кіруюць жыццём дзяцей, прымаючы на сябе ўсю адказнасць за іх жыццё і здароўе, потым ужо дарослыя дзеці «лепш ведаюць, як будзе лепш». І ці не на гэтай глебе жадання гвалтоўна ашчасліўіць блізкіх адбываецца мноства ўнутрысямейных канфліктаў, якіх можна было пазбегнуць, калі слухаць і чуць адно аднаго?*

*Дзесьці ў ідэальным свеце так яно і адбываецца: кожны гаворыць пра свае жаданні, потым на сямейнай радзе выпрацоўваюць алгарытм дзеянняў, не ставячы ўльтыматумаў і невыканальных умоў, проста таму, што любяць, шануюць і падтрымліваюць адно аднаго. У свеце рэальным, канешне, інакш. Мы спрачаемся і саступаем, сварымся і мірымся, нагадваем аднаго аднаму аб правах і абавязках, маніпулюем і трываем, адстойваем сваю пазіцыю і ахвяруем, спрабуем «перавыхаваць» малых і дарослых сямейнікаў і крыўдуем, калі хтосьці робіць падобнае з намі самімі, робім памылкі і — мабыць, прыкмета сапраўднай сталасці — просім за іх прабачэння. Калі б у школе жыцця выстаўлялі адзнакі, цікава, ці многія з нас атрымалі б «выдатна» ці хоць бы «добра»? Але, хочацца верыць, такія розныя, мы ў розных сямейных укладах усё ж вучымся — жыць, любіць, дараваць, цаніць і берагчы. Бо менавіта з цаглінак моцных, шчаслівых сем'яў будуецца моцнае грамадства, і ніяк інакш.*

*Між тым вучыцца гэтаму ніколі не позна. Хоць бы і на бягучым тыдні. Тым больш Міжнародны дзень сям'і, зацверджаны Генеральнай асамблеяй ААН, адзначаецца 15 мая ў розных краінах ужо больш як чвэрць стагоддзя. У свята ёсць свая перадгісторыя, сур'ёзны ідэалагічны падмурак, маштабная асветніцкая, публічная і забаўляльная праграма, адметная эмблема і нават канкрэтная тэма, якая змяняецца штогод. У 2015-м гэта гучала, напрыклад, як «Гендарная роўнасць правоў і правы дзяцей у сучасных сем'ях», у 2018-м тэмай сталі «Сем'і і інклюзіўнае грамадства», летась — «Сем'і і меры па барацьбе са змяненнем клімату». Сёлета, па ўсім відаць, у цэнтры ўвагі будуць пытанні здароўя і клопат пра блізкіх — нездарма днямі Генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш расказаў, як кожны дзень тэлефануе сваёй састарэлай маці — не з мэтай яшчэ раз строга нагадаць пра важнасць самаізаляцыі, а проста каб распытаць, як яе справы і здароўе, каб хоць неяк кампенсаваць увагай і клопатам на адлегласці недахоп жывых стасункаў.*

*Сярод беларускіх прыказак і прымавак ёсць такая: згодную сям'ю і гора не бярэ. На мой погляд, выдатны сямейны дэвіз. Асабліва цяпер.*

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Азбука прафесій

# Спяшайцеся павольна,

## або Мой тата — кіроўца



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**Вадзіцель сталічнага аўтобуснага парка Яўген ГАЛУШКА за «баранкай» ужо амаль 20 гадоў. Хоць у дзяцінстве ён машынамі не цікавіўся і нават не ўяўляў сябе ў вадзіцельскім крэсле. А цяпер, смяецца, назапашаны вопыт перадаць няма каму: усе трое дзяцей у сям'і — дзяўчаты! Тым не менш сярэдняя дачка, 13-гадовая Яна, якая знутры бачыла бацькаву работу, цяпер складае яму кампанію ў «Танках» і ахвотна абмяркоўвае з журналістамі «СГ», ці ўсякі, хто атрымаў пасведчанне кіроўцы, можа ім лічыцца...**

***— Ці ведаеш, чаму тата пайшоў у вадзіцелі?***

**Яна:** Шчыра, не ведаю. Але думаю, што яго проста... павяло туды.

**Яўген Міхайлавіч:** Што-што са мной адбылося?.. *(Смяецца).* Ну, па вялікім рахунку, Яна мае рацыю. Ніколі мяне да машын не цягнула, але аднойчы ўбачыў аб'яву — набіралі людзей на курсы кіроўцаў тралейбуса, і вырашыў: чаму б не? Паўгода вучобы — тэорыя, практыка, стажыроўка, а ў лістападзе 2001 года першыя самастойныя выезды. Чаму змяніў тралейбус на аўтобус? Надакучыла ездзіць «прывязаным». Што вы смяецеся, праўду кажу: калі нейкая аварыя, тралейбус яе ніяк не аб'едзе, стаіш, чакаеш, пасажыры нервуюцца, а я чалавек спагадлівы, перажываю, што, можа, хто з іх спазняецца па важных справах, а я нічым дапамагчы не магу... Аўтобус — іншая справа. ДТЗ на дарозе? Аб'язджаеш, і далей па маршруце. Насамрэч, канешне, спатрэбілася перавучвацца — за ўласныя грошы пайшоў на курсы і здаў на катэгорыю D, так што цяпер у мяне ўсе вадзіцельскія катэгорыі, акрамя, напэўна, матацыкла.

***(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)***

Сітуацыя

# ВЯСЕЛЛЕ НАСУПЕРАК

## У маі менш рэгіструюць шлюбы, але не з-за каранавіруса

**У канцы лютага ў Беларусі быў зарэгістраваны першы выпадак каранавіруснай інфекцыі. Яе знайшлі ў іранскага студэнта БНТУ па імені Парса. Два тыдні ў бальніцы — і нечаканая папулярнасць: прамыя эфіры ў Instagram глядзеў нават медперсанал бальніцы. Яны ведалі, што хлопец і там расказвае людзям, як абараніць сябе ад каранавіруса.**

7 сакавіка першыя аналізы студэнта на COVID-19 сталі паказваць адмоўны вынік, а 12 сакавіка маладога чалавека адпусцілі дадому. Як гаворыцца, «да вяселля зажыло». І сапраўды, аказалася, што за дзень да таго, як у Парса выявілі вірус, малады чалавек са сваёй дзяўчынай падалі заяву ў загс, каб у маі зарэгістраваць шлюб. Карэспандэнт «СГ» даведалася, якія меры прымаюць работнікі загса для таго, каб прадухіліць распаўсюджванне віруса пасля таго, як Сусветная арганізацыя аховы здароўя абвясціла пандэмію.

Адной з прыкмет таго, што ў краіне — эпідэмія віруса з'яўляецца ўстаноўка ў грамадскіх месцах дазатараў з дэзінфіцыруючымі сродкамі. Пры ўваходзе ў загс Маскоўскага раёна Мінска таксама ўстаноўлены дазатар, таму я ўжо «на аўтамаце» апрацавала рукі. Пасля абеду ва ўсім будынку стаіць ледзь прыкметны «водар» гэтых сродкаў.

***(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)***



# ВЯСЕЛЛЕ НАСУПЕРАК

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

— Сёння павялічылася нагрузка на тэхнічак, якім прыходзіцца прыбіраць часцей, чым раней, — расказвае **начальнік аддзела загса Наталля ФІЛІМОНАВА.** — У будынку прыбіраем тры разы на дзень, апрацоўваем нават ручкі дзвярэй спецыяльнымі сродкамі. Супрацоўнікі ўстановы вядуць прыём у масках і пальчатках, каб абараніць не толькі сябе, але і наведвальнікаў.

Загс працуе ў звычайным рэжыме: з аўторка да суботы. У гэтыя дні можна падаць заяву на рэгістрацыю шлюбаў, зарэгістраваць дзіця і развесціся. Цырымонію шлюбу можна правесці ў любы дзень, але ўрачыстую — толькі ў пятніцу і суботу. Маладыя людзі, якія запланавалі ўрачыстасць загадзя і не рашаюцца адмяніць, прыслухоўваюцца да рэкамендацый супрацоўнікаў загса:



— Традыцыйныя вяселлі, з вялікай колькасцю гасцей, мы прапануем перанесці на час, калі скончыцца пандэмія, — расказвае Наталля Філімонава. — Звычайна на такія вяселлі прыходзіць каля 70 чалавек, там шмат дзяцей і пажылых людзей. Маладыя з разуменнем ставяцца да рэкамендацый і некаторыя пераносяць заключэнне шлюбу на верасень. Іншыя проста скарачаюць колькасць гасцей. У выніку прыходзіць не больш за трыццаць чалавек.

У параўнанні з мінулым годам колькасць шлюбаў у гэтым месяцы трошкі паменшылася, але супрацоўнікі загса гэта звязваюць, хутчэй, з народнай прыкметай: маўляў, ажэнішся ў маі — будзеш «маяцца» ўсе жыццё. А гэты май яшчэ і ў высакосным годзе — такая акалічнасць не надае ўпэўненасці маладым, якія вераць у прыкметы.

Сёння хлопцы і дзяўчаты прыходзяць пісаць заявы на заключэнне шлюбу на канец ліпеня і жнівень.

— У нашым загсе можна запісацца на ўрачыстую рэгістрацыю шлюбу загадзя, — расказвае начальнік загса. — Пары, якія запісваліся яшчэ летась, прыходзяць, каб пацвердзіць свае намеры пажаніцца ў выбраны дзень. Усе, хто некалі забраніраваў даты, спадзяюцца, што ў іх усё атрымаецца і вяселле адбудзецца.

У фае загса збіраюцца госці. Людзей няшмат — чалавек восем. Яны чакаюць прыезду маладых. Пажылы мужчына абураецца:

— Нейкае глупства прыдумалі: маскі, пальчаткі, дэзрастворы. Ну вось навошта здаровым насіць маску? Яны нікога не заражаюць. Прыйшоў у загс, а нас тут сустракаюць у масках! Адчуванне, што зараз павязуць на «хуткай». Мне гэта не падабаецца. Колькі гэтых вірусаў ходзіць круглы год, што, цяпер заўсёды «маскіравацца»?...

— Не згодны з табой, — парыруе малады чалавек, запрошаны на вяселле. — Мне, напрыклад, вельмі прыемна, што пра нашу бяспеку паклапаціліся нават у загсе. Сюды прыходзіць шмат людзей. Супрацоўнікі маглі заразіцца каранавірусам, але яны ў масках, таму нават калі хворыя, то шанцаў нас заразіць у іх менш. Добра, што людзі прыслухоўваюцца да рэкамендацый урачоў і трымаюцца правілаў гігіены.

Хутка з'яўляюцца маладыя. Спрэчка адразу заціхае, людзі пачынаюць фатаграфавацца. Маладыя Алег і Ксенія не стрымліваюць сваё шчаслівае хваляванне.

— Мы з хваляваннем чакалі гэты дзень, — расказвае жаніх. — Падалі заявы, калі яшчэ не было абвешчана пандэміі, і вырашылі ўжо не адмяняць. Вельмі перажывалі, што з-за віруса ўлады прымуць рашэнне ўвогуле адмяніць рэгістрацыю шлюбаў. З самага пачатку мы не планавалі шмат гасцей, таму і не прыйшлося скарачаць колькасць запрошаных на рэгістрацыю. Але святкаванне вяселля ў рэстаране ўсё ж адмянілі, каб не падвяргаць небяспецы нашых пажылых сваякоў. Любім іх і таму турбуемся.

Беларусы падчас пандэміі могуць зарэгістраваць свае адносіны, у адрозненне ад некаторых іншых краін. Так, напрыклад, у Расіі былі ўведзены абмежаванні на рэгістрацыю шлюбаў. Давалі дазвол толькі ў выключных выпадках, але рэгістрацыя праходзіла без запрошаных.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

Што ў кашальку

# ЯК ГРОШЫ ПРАЦУЮЦЬ НА ВАС

**Уклад з'яўляецца адным з варыянтаў, які дапаможа зберагчы і разам з тым пусціць у абарачэнне і прымножыць свае грашовыя сродкі. Аднак, каб не прагадаць з такой інвестыцыяй, варта спярша разабрацца, на што звярнуць увагу, каб у выніку не застацца ў мінусе...**

## Схаваная выгада

— Калі казаць пра банкаўскія прадукты, якія сёння існуюць у Беларусі для прымнажэння грошай, то тут ёсць тры варыянты: **дэпазіты** (уклады), **аблігацыі** і **давернае ўпраўленне** (калі кліент перадае свае грошы банку ва ўпраўленне, а той, укладваючы іх у інструменты інвеставання, забяспечвае свайму кліенту пэўную прыбытковасць). Што датычыцца зразумеласці і даступнасці вышэйназваных інструментаў, то ўклады — самы распаўсюджаны і просты для большасці людзей варыянт. Яго цяпер часцей выкарыстоўваюць менавіта з мэтай зберажэння грашовых сродкаў. Прыбытковасць па іх, безумоўна, вымагае жадаць лепшага, затое няма рызыкі, якая прысутнічае, калі разглядаць, напрыклад, аблігацыі. Бо там адсутнічае гарантыя вяртання грошай, тобок, вы можаце ўкласціся і застацца як у плюсе, так і ні з чым, — зазначае **фінансавы кансультант Святлана МУРАШКА.**

**У наш час можна ў інтэрнэце знайсці водгукі кліентаў таго альбо іншага банка і на падставе іх ужо зразумець, хто і як выконвае свае абавязацельствы перад кліентамі-ўкладчыкамі.**

Магчымасць скарыстацца тым ці іншым варыянтам ёсць у кожнага, проста важна разумець нюансы і мець пэўныя веды. Вернемся да дэпазітаў. У любым банку ёсць свае прапановы ў гэтым кірунку і, трэба сказаць, яны самыя разнастайныя. Усе ўклады падзяляюцца на тэрміновыя (вяртанне дэпазіту магчымае ў тэрмін, абазначаны ў дагаворы, працэнтная стаўка, як правіла, залежыць ад тэрміну ўкладу: чым даўжэйшы перыяд, тым вышэйшы працэнт); умоўныя (уклад вяртаецца пры наступленні пэўных умоў); да запатрабавання (зняць грошы можна ў любы час без змены ўмоў).

Сёння, па ацэнках фінансавага кансультанта, з пункту гледжання прыбытковасці складана сказаць, які дэпазіт з'яўляецца больш выгадным. А вось маючы мэту проста захаваць свабодныя грошы, варта звярнуць увагу на тыя прапановы банкаў, дзе вышэйшы працэнт. Як правіла, вышэйшы ён у безадзыўных укладаў (банк захоўвае вашы грошы пэўны перыяд і раней, чым ён скончыцца, вы не будзеце мець доступу да сваіх сродкаў).

## Выбірай і правярай

Цяпер давайце разбірацца, на што варта звярнуць увагу пры жаданні аформіць для сябе ўклад. Самае першае — гэта выбар банка, у якім будзеце адкрываць дэпазіт. У наш час можна ў інтэрнэце знайсці водгукі кліентаў таго альбо іншага банка і на падставе іх ужо зразумець, хто і як выконвае свае абавязацельствы перад кліентамі-ўкладчыкамі. Тым больш што ў нас няма вялікай колькасці банкаў, таму сарыентавацца і вывучыць інфармацыю лягчэй, чым у суседніх краінах.

Па-другое, выбар тэрміну дэпазіту — будзе ён адзыўны (забраць можна ў патрэбны для вас час, праўда, тут магчыма прымяненне да вас штрафных санкцый) ці безадзыўны (доступ да грошай у вас з'явіцца толькі пасля заканчэння тэрміну ўкладу: паўгода, 3 альбо 10 гадоў і г. д.). Па-трэцяе, працэнт па дэпазіце. Ёсць фіксаваныя і плаваючыя стаўкі. Фіксаваная працэнтная стаўка застаецца нязменнай на працягу ўсяго перыяду размяшчэння ўкладу, таму яна гарантуе даходнасць. А вось плаваючая працэнтная стаўка — гэта перспектыва, якую прадбачыць складана, бо яна залежыць ад стаўкі рэфінансавання ці можа быць зменена па рашэнні самога банка. Тут можна як выйграць, так і застацца з меншым прыбыткам. Паколькі мы хочам, каб нашы грошы працавалі і прыносілі даход (які як мінімум пакрые інфляцыю), то выбар варта рабіць узважана. Як ужо гаварылася, вышэйшую стаўку прапаноўваюць па тых укладах, якія вы размяшчаеце ў банку на доўгі тэрмін і не плануеце забіраць загадзя. Тут ёсць яшчэ такі момант, як налічэнне працэнтаў на працэнты — капіталізацыя (калі на налічаныя за месяц працэнты па ўкладзе і суму дэпазіту зверху налічваецца яшчэ працэнт). Па-чацвёртае, звяртайце ўвагу, ці зможаце вы пры жаданні папаўняць дэпазіт. У выпадку афармлення безадзыўнага ўкладу даведайцеся, пры якіх умовах вы зможаце папрасіць банк вярнуць вам грошы часткова альбо цалкам, напрыклад, у выпадку нейкіх форс-мажорных абставін.

## Арыентавацца на сябе

Не менш актуальнае ў згаданай тэме і тое, як дзейнічаць укладчыку ва ўмовах фінансавага крызісу. Спецыяліст прытрымліваецца меркавання, што варта глядзець выключна на ўласныя абставіны.

**Маючы мэту проста захаваць свабодныя грошы, варта звяртаць увагу на тыя прапановы банкаў, дзе вышэйшы працэнт. Як правіла, вышэйшы ён у безадзыўных укладаў.**

— Адносна тых дэпазітаў, якія ёсць на сёння, на мой погляд, не варта рабіць рэзкіх рухаў. Але ж мы разумеем, што ўсё індывідуальна. Трэба ўлічваць, якая сума ляжыць у банку і якое цяпер ваша фінансавае становішча. Маглі ўзнікнуць, напрыклад, праблемы з бізнесам ці чалавек застаўся без работы. Але, калі грошы не асабліва патрэбны, а проста пытанне ў тым: забіраць уклад ці пакінуць, то я б раіла апошняе. Таму што зберагаць свае грошы ў банку больш надзейна, чым трымаць іх дома, — кажа Святлана Мурашка. — Ці варта адкрываць ва ўмовах крызісу новы ўклад — таксама пытанне без універсальнага адказу. Калі маеце свабодныя грашовыя сродкі і не ведаеце, як іх выкарыстаць, тады лепш за ўсё аднесці іх у банк.



**Уклады — самы распаўсюджаны і просты для большасці людзей варыянт... Прыбытковасць па іх, безумоўна, вымагае жадаць лепшага, затое няма рызыкі, якая прысутнічае, калі разглядаць, напрыклад, аблігацыі.**

Што да выбару валюты ўкладу, то нашы банкі прапаноўваюць некалькі варыянтаў — беларускія рублі, долары, еўра, расійскія рублі. У кожнай валюты свае перавагі. Уклад у беларускіх рублях — гэта шырокая даступнасць і прастата ў афармленні плюс больш высокая працэнтная стаўка, чым па валютных дэпазітах. Аднак, калі вы збіраеце на замежную вандроўку ці на набыццё жылля, то лепш, верагодна, арыентавацца на валютныя варыянты.

**Тэма, якая часам непакоіць нас і сее сумненні яшчэ на этапе ідэі адкрыцця дэпазіту: ці не застануся я падмануты і без грошай, калі банк, напрыклад, абанкруціцца? Тут можна адназначна супакоіцца, бо ў нас сфера банкаўскіх укладаў абараняецца і рэгулюецца законам. Дзяржава гарантуе захаванасць грашовых сродкаў укладчыкаў як у беларускіх рублях, так і ў замежнай валюце. У мэтах гарантаванага вяртання дэпазітаў насельніцтву ў Беларусі створана Агенцтва па гарантаваным кампенсаванні банкаўскіх укладаў. А значыць, вашы грошы пад надзейнай аховай.**

**Алена ДРАПКО.**

# ПАКІНЬЦЕ ЎЗРОСТ ПАШПАРТУ

## Сяргей СКЛЯРАЎ страціў вагу для драйву і самаадчування «на 20»

**Не ставіць на сабе ні крыж, ні шматкроп'е і ўспрымаць гады як выклік сабе. Такімі думкамі кіруецца па жыцці Сяргей Скляраў, музыкант, фронтмен гурта The Road Dogs Belarus, прэссакратар Белгазпрамбанка, які зразумеў, што мае лішнюю вагу, дзякуючы... празмернай актыўнасці. Прывесці сябе ў форму ён вырашыў з дапамогай штодзённых васьмікіламетровых прагулак з палкамі, жадання адчуваць сябе, як у 20, і самастойна складзенага спіса страў.**



### Без цукру і бульбы

Сяргей Скляраў скінуў, здаецца, не так шмат — усяго восем кілаграмаў, але менавіта яны былі тым самым лішкам, які не даваў жыць напоўніцу.

— Наш гурт выступае досыць часта, па некалькі разоў на тыдзень. Прычым мы заўжды іграем ужывую і ў клубах. А ўвогуле ж, выконваць блюз-рок немагчыма, калі не варушыцца. Я стаў заўважаць, што ў другім аддзяленні мне пачало не хапаць энергіі і драйву. Усё, здаецца, цудоўна, але стамляюся. Вырашыў, што трэба нешта мяняць, а калі некалькі разоў падышоў да вагаў, мне не зусім спадабалася тое, што я там убачыў. Я ніколі не быў фанатам спорту. Абсалютна раўнадушны да футбола, не захапляюся хакеем. Люблю гладзець аўтагонкі — гэта мой любімы від спорту, які прыносіць задавальненне.

**«Бег, вядома, паказаны, не ўсім, але ж можна проста хадзіць, рухацца, варушыцца».**

***— Што вы рабілі, каб зменшыць вагу?***

— Пачытаў шмат інфармацыі ў інтэрнэце. Адразу вырашыў, што прыём нейкіх прэпаратаў, — гэта не для мяне. Па звестках, што знайшоў у сеціве, падабраў сабе дыету. Выключыў з рацыёну цукар, мучное, тлустае — усе тыя празмернасці, якія так падабаюцца людзям і чакаюць нас каля тэлевізара, на рабоце і ў крамах на самых прыметных месцах. Ад усяго гэтага шчасця прыйшлося адмовіцца, як і ад любімай стравы беларусаў — бульбы. Перайшоў на рыбу і морапрадукты.

***— Падбіралі харчаванне самастойна, без парад дыетолагаў?***

— Вядома, я ж мужчына. Акрамя таго, мая маці медык, я і раней пачытваў літаратуру, звязаную з дыетамі, здаровым ладам жыцця. А паколькі да свайго пахудзення паставіўся сур'ёзна, то прачытаў шмат і пра дыеты, і пра ўздзеянне фізічных нагрузак, і якімі яны павінны быць у маім узросце, бо мне ўсё ж не 20, хоць хочацца адчуваць сябе, як у 20. І гэта была яшчэ адна з матывацый, каб прывесці сябе ў форму. Аднак перш чым пачынаць худзець, усё ж лепш параіцца з урачом. Дактары ў нас кампетэнтныя, і яны параяць, ці можаце вы гэта рабіць, ці нейкія хранічныя захворванні перашкодзяць неадкладнаму старту абгрэйду вашага цела.

### Калі пачаў — не адмаўляйся

Акрамя змены рацыёну, Сяргей Скляраў дадаў у праграму па змене сябе штодзённы васьмікіламетровы шпацыр з палкамі. Прычым гэта было тады, калі ў Беларусі яшчэ мала хто ведаў і тым больш практыкаваў скандынаўскую хаду.

***— Кажуць, што калі палкі няправільна выкарыстоўваць, то гэта прыносіць больш шкоды, чым карысці. Вас нехта вучыў з імі ўпраўляцца?***

— Памятаеце, раней у нас зімой быў снег, і ва ўсіх школах вучні займаліся лыжамі? Мяне яшчэ бацька навучыў хадзіць на лыжах, і ў скандынаўскай хадзе падобная тэхніка. Мне ўвогуле складана ўявіць, як можна нашкодзіць сабе з дапамогай скандынаўскай хады, пэўна, толькі калі ты няправільна апрануты і абуты. Знаёмы, які прадаў мне першую пару палак, паказаў, як імі карыстацца, і я пачаў займацца. Галоўнае, нешта ўпершыню пачаўшы, не адмаўляцца ад гэтага, тады яно спрацуе. Тым больш што свае прагулкі я пачынаў увосень гадоў пяць таму, пасля прыйшла зіма, было снежна і холадна. Трэба было не даваць сабе слабіну і ў любое надвор'е выходзіць на заняткі: навушнікі з любімай музыкай — і ўперад, на дыстанцыю.

***— Восем кіламетраў — немаленькая адлегласць. Чаму вы пачалі адразу з такой дыстанцыі?***

— Я жыву ў цэнтры Мінска недалёка ад Камсамольскага возера. І мне проста было зручна хадзіць ад моста, што ў Траецкім прадмесці, да моста па вуліцы Арлоўскай. Гэта якраз каля васьмі кіламетраў. Аднак падкрэслю, што дыстанцыю гэтую трэба праходзіць у досыць добрым тэмпе. Усё гэта працуе, толькі калі разам з фізічнай нагрузкай вы адначасова вытрымліваеце нізкакаларыйную дыету. Формула для пахудзення вельмі простая. Трэба ствараць дэфіцыт калорый: каб аб'ём калорый, якія вы траціце падчас трэніровак, перавышаў тую колькасць, якую вы прымаеце за суткі з ежай. Калі ж аб'ёмы і від харчавання застаюцца ранейшыя, то выніку будзеце чакаць доўга, бо арганізм вельмі неахвотна расстаецца з назапашанымі кілаграмамі.

### Мэта — выклік сабе і паўмарафон

Музыкант кажа, што не ставіў на мэце хуткае пахудзенне і страчваў лішак кілаграмаў на працягу года. Затое дасягнуў вагі, у якой адчувае сябе камфортна. А са змяненнем сябе нарадзіліся і новыя мэты ў жыцці.

**«Трэба ствараць дэфіцыт калорый: каб аб'ём калорый, якія вы траціце падчас трэніровак, перавышаў тую колькасць, якую вы прымаеце за суткі з ежай».**

— Страчаныя мной восем кілаграмаў — гэта, зразумела, не супер-рэкорд, але ж у мяне і да гэтага была досыць нармальная вага і не было крытычных медыцынскіх паказчыкаў, каб тэрмінова худзець. Хутчэй, гэта мая ўласная ініцыятыва. Аднак і такія вынікі стварылі дадатковыя складанасці — прыйшлося мяняць гардэроб. Джынсы змяніў з 32 памеру на 30-ы.

***— Як навакольныя паставіліся да вашага жадання пахудзець? Вось і мама-медык, пэўна, нейкія карысныя парады давала?***

— Мая мама ўжо на пенсіі. Яна чалавек савецкай загартоўкі, таму здзівілася майму памкненню. У яе разуменні ў пэўным узросце ўжо трэба ўспрымаць сябе адпаведна і не намагацца змагацца з, як яна лічыць, натуральным працэсам. Але ж у нас цяпер інтэнсіўнасць і эфектыўнасць жыцця павялічваюцца. Жонка ўспрыняла маё жаданне на «ўра», бо яна і сама ўся ў фітнесе, так што цалкам падтрымала. Тым больш што і гатаваць стала прасцей, бо я стаў есці тое, што яна ўжывала і раней.




***— Што прынесла змяншэнне вагі? Большую рухавасць, прывабнасць, задаволенасць сабой?***

— Я застаўся такі ж рухавы, як і быў, мне проста стала лягчэй. Для чаго пачаў худзець увогуле? Каб потым пачаць бегаць, трымаць сябе ў тонусе. Гэта быў пэўны выклік сабе — даказаць, што ты можаш. За год падрыхтоўкі я пазбавіўся ад лішняй вагі, умацаваў корпус: спіну, тулава, прэс, ногі. Пасля гэтага перайшоў непасрэдна да бегу. Мой першы паўмарафон прайшоў у Варшаве, і я на яго трапіў праз год пасля таго, як пахудзеў. Спачатку была мэта проста прабегчы яго і дабегчы да фінішу без траўмаў, і я з гэтым справіўся. Пасля бегаў дыстанцыі і ў Беларусі. Я стараўся заўсёды раз ці два на год удзельнічаць у паўмарафонах. Да таго ж, цяпер існуе мноства бегавых клубаў, а дасягаць сваіх мэт значна прасцей, калі побач аднадумцы. Калектыў — гэта страшная сіла.

### Вырвацца з пасткі хранічных хвароб

Сяргей прызнаецца, што яго вага і цяпер крыху «хістаецца», аднак цяпер ён больш пільна сочыць за сваім ладам жыцця і актыўнасцю. І нават рыхтавацца да забегаў стала значна прасцей, чым раней, бо з'явілася база.

**«Я ніколі не быў фанатам спорту. Абсалютна раўнадушны да футбола, не захапляюся хакеем. Люблю гладзець аўтагонкі — гэта мой любімы від спорту, які прыносіць задавальненне».**

***— Што вы параілі б мужчынам, якія, як паказвае практыка, найчасцей падабаюцца сабе ў любым выглядзе?***

— Мне складана падабраць нейкія правільныя словы, бо я не гуру здаровага ладу жыцця. Аднак калі вы хочаце адчуваць сябе не на свой узрост у пашпарце, а на тыя гады, калі вам было камфортна і добра, то трымайце сябе ў тонусе, а лічбы ў пашпарце расцэньвайце як выклік. Дарэчы, дасягнуўшы мэт, якія вы ставілі перад сабой, нават калі яны яшчэ і не канчатковыя, абавязкова ізноў схадзіце да ўрача. Вашы аналізы пакажуць, што стан вашага цела значна больш малады, чым вы самі. Увогуле, ва ўсіх людзей, якія жывуць у горадзе і сядзяць у офісах, ёсць праблема дэфіцыту рухальнай актыўнасці. А праз яго наша цела рыхтуе нам пасткі ў выглядзе хранічных хвароб. Бег, вядома, паказаны, не ўсім, але ж можна проста хадзіць, рухацца, варушыцца.

Мяне больш за ўсё засмучае, калі нашы мужчыны (дарэчы, такое я заўважаю менавіта ў Беларусі — на Захадзе па-іншаму) ставяць на сабе калі не крыж, то шматкроп'е пасля пэўнага моманту і думаюць, што ўсё скончылася ды можна спакойна плыць па цячэнні. З іншага боку, я бачу людзей, значна старэйшых за мяне, якія вядуць актыўнае жыццё. Калі ў нас такіх мужчын будзе больш, то і краіна стане іншай.

**Ірына СІДАРОК.**

Мамін дзённік

# «Ледзяшы» ў спадчыну

**У гэтую велікодную раніцу на вуліцу з Цёмікам пайшлі бабуля з дзядулем. Я тым часам гатавала святочны абед, паралельна адказваючы на тэлефонныя званкі-віншаванні. Праз якую гадзіну вярнуліся мае «прагульшчыкі». Цёмка — заплаканы і сярдзіты, бацькі — чымсьці незадаволеныя. «Што здарылася?» — пытаюся. Аказалася, не далі прыцягнуць дадому чужую цацку, якую малы бесцырымонна забіраў з суседскай пясочніцы. «Такі ўпарты!» — толькі і сказала раззлаваная бабуля. «Відаць, «цяжкое» ў Цёмкі дзяцінства, у драўляныя цацкі гуляе...» — з іроніяй дадаў мой брат.**

Нас з ім асабліва не песцілі. Цацак было няшмат. Затое як бераглі! Мама дагэтуль згадвае, як плакаў мой брат, калі бацька падчас сямейнага скандалу раздушыў нагой яго любімую машынку, якую малы, супакоіўшыся, склейваў потым па дэталях. А мне нават у галаву не прыходзіла выкідваць паламаныя лялькі, а калі іхняе адзенне патрабавала рамонту, нітку і іголку ў рукі — і новае ўбранне было гатова. З некаторымі маімі цацкамі можна гуляць і цяпер.

Толькі Цёміка гумавыя малпы, пластыкавыя коні, а тым больш лялькі Барбі не цікавяць. У яго ў кожным пакоі вяскова-вай кватэры, дзе мы пакуль жывём, то транспартныя сродкі, на якіх ён па чарзе катаецца, то паркінг з самымі рознымі машынамі, то скрыня з цацачнымі жывёламі, развівальнымі кубікамі ды іншай драбязой, то паліцы з вёдрамі, пірамідамі, дзіцячымі кнігамі, дзіцячымі піяніна, канструктарам... Не менш цацак і ў іншай бабулі, дзе мы рэгулярна бываем. Але ж малому, відаць, недастаткова, што цягне іх яшчэ і з вуліцы!



На днях купілі яму красоўкі. Дзве пары. Але памераць не далі рады — не буду і ўсё! Толькі праз некалькі дзён адну пару ўсё ж неяк насунулі. Калі ж Цёмік убачыў, што падэшва ў іх свеціцца рознымі агеньчыкамі, то здымаць абутак ужо не хацеў. «Абнавіў» падчас першай жа прагулкі па вуліцы, калі барабаніў нагамі па кантэйнерах са смеццем...

Я ў свой час новы абутак мела зрэдку: як самая малодшая ва ўсёй радні даношвала за старэйшымі братамі і сёстрамі. І колькі радасці было, калі стрыечная сястра перадавала мне торбы з не патрэбнымі ўжо ёй джынсамі, кофтамі і сукенкамі! А было і такое, што атрымлівала ў спадчыну сябар, які гадоў з дзесяць таму насіў мой дзядзька, а пасля яго — малодшыя дзеці (мае стрыечныя браты і сёстры). Не ў адных абноўках ходзіць і мой Арцёмка: выручаюць рэчы брацікa Вадзіка, пляменніка мужа.

Да чаго ж быў здзіўлены мой брат, калі ўбачыў, як Цёмка п'е гарбату з жалезнай, можна сказаць, рарытэтнай конаўкі, з якой гадоў 25—35 таму пілі і мы з Валерам. Дзед жартуе — маўляў, лепшай не знайшлі, — а мне падабаецца: па-першае, не паб'е, па-другое, захоўваецца нейкая перaемнасць. Такое ж адчуванне і тады, калі малы плюскаецца ў ваннaчцы з рыбкамі з майго дзяцінства альбо ходзіць у крыху смешных штоніках, якія насіў яшчэ яго бацька.

Я не асуджаю бацькоў, якія імкнуцца, каб у іх дзяцей было выключна ўсё новае, нікім дагэтуль не выкарыстанае. Многія тлумачаць гэта тым, што ў іх нашчадкаў павінна быць лепшае дзяцінства. Я на сваё дзяцінства не грашу. Не ў багатай сям'і нарадзілася, у вёсцы жыла, прысмакі розныя былі толькі на святы і ў дні, калі бацькі атрымлівалі палучку. Затое берагла кожную абноўку, ежай не кідалася, радавалася новай ляльцы ці альбому для малявання.

...Днямі Цёміку споўнілася два гадкі. Гасцей у яго было няшмат, але і тыя напрынoсілі падарункаў — на цэлы дзіцячы садок хапіла б. І што вы думаеце, новыя машынкі ўжо валяюцца па кутах, дом з канструктара ў вольныя ад працы гадзіны будуе бабуля, маляванкі з алоўкамі ўжо пахаваны да лепшых часоў, каб малы іх не пашкодзіў. Праўда, на самакаце ганяе, але цярпення хапае ненадоўга. Сапраўднае задавальненне Арцёмку прыносяць, бадай, толькі паветраныя шарыкі, якімі на дзень народжання была ўпрыгожана кватэра. Яны ўжо некалькі дзён па чарзе шпурляюцца малым шкоднікам у люстру, ад якой толькі сыплюцца «ледзяшы»... І каб не гэтая старая люстра, якая, можна сказаць, таксама засталася Цёміку ў спадчыну, ці было б у нашым доме столькі радасці і смеху!? І слёз таксама...

**Вераніка КАНЮТА.**

Будзьце здаровыя!

# «РЫЗЫКА ІНФІЦЫРАВАННЯ ДЗІЦЯЦІ ВЕЛЬМІ НІЗКАЯ»

## Спецыялісты расказалі пра цяжарнасць і роды ў жанчын, хворых на COVID-19

**У Беларусі ўжо нарадзілася больш за дзясятак здаровых дзяцей ад жанчын, якія хварэюць на каранавірусную інфекцыю. Якія асаблівасці ў такіх родаў, у якіх раддамах Мінска іх прымаюць, ці ўваходзяць цяжарныя жанчыны ў групу рызыкі па заражэнні COVID-19? На гэтыя і іншыя актуальныя пытанні адказалі падчас анлайн-стрыму «Марафон жаночага здароўя» галоўны пазаштатны інфекцыяніст камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Мікіта САЛАВЕЙ, галоўны пазаштатны акушэр-гінеколаг па амбулаторнай дапамозе камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Аксана КАРОТКІХ, намеснік галоўнага ўрача па радапамозе 6-й гарадской клінічнай бальніцы Ірына БОРЫС.**



### Рызыка заражэння такая ж

***— Ці праўда, што цяжарныя больш схільныя да інфіцыравання каранавірусам?***

**М. С.** — Сёння мы дакладна ведаем, што цяжарныя жанчыны схільныя да COVID-19 гэтак жа, як і нецяжарныя, — ні больш, ні менш. Але цяжарная жанчына павінна прытрымлівацца стандартных мер прафілактыкі інфіцыравання. Любая інфекцыя падчас цяжарнасці можа нанесці пэўную шкоду не толькі арганізму жанчыны, але і арганізму яшчэ не народжанага дзіцяці. Таму лепш пазбягаць і каранавіруснай, і іншых рэспіраторных інфекцый падчас усяго перыяду цяжарнасці.

Цяжарнасць не ўплывае на складанасць цячэння COVID-19, і тут важная адсутнасць у жанчыны іншых спадарожных хвароб. Але каранавірус можа павялічваць рызыку заўчасных родаў. Не вельмі пакуль зразумела, з чым гэта звязана, але гэта паказваюць даследаванні. Калі жанчына перанесла інфекцыю на позніх тэрмінах цяжарнасці, рызыка інфіцыравання дзіцяці вельмі нізкая. Вірус не перадаецца трансплацэнтарна і падчас натуральных родаў. Пасля нараджэння інфіцыраванне магчымае, калі дзіця не разлучаецца з хворай маці.

### Роды прымаюць у ахоўных касцюмах

Аксана Караткіх расказала, што сёння ў Мінску цяжарныя жанчыны, хворыя на COVID-19, нараджаюць у раддоме 6-й гарадской клінічнай бальніцы — ён працуе як інфекцыйны. Жанчыны, якія з'яўляюцца кантактамі першага і другога ўзроўняў, нараджаюць у асобным корпусе раддома 3-й гарадской клінічнай бальніцы. Сталічныя раддамы № 2, а таксама 1-й і 5-й гарадскіх клінічных бальніц працуюць у звычайным рэжыме.

***— Як прымаюць пацыентак з COVID-19?***

**І. Б.** — Пры паступленні такіх пацыентак іх сустракаюць медработнікі ў сродках індывідуальнай аховы. У 6-м раддоме, які цяпер працуе як інфекцыйны, ёсць магчымасць ізаляваць жанчыну ў індывідуальную палату з асобным выхадам, прыбіральняй. Калі пацыентка паступае падчас родаў, яна ізалюецца ў індывідуальную радзалу. Медперсанал прымае роды ў ахоўных касцюмах. У цяжарнай з COVID-19 кожную гадзіну вымяраюць насычэнне крыві кіслародам, каб ацаніць дыхальныя магчымасці, часцей робіцца КТГ плода. Калі неабходна кіслародная падтрымка, аказваюць і яе.

**Каранавірус можа павялічваць рызыку заўчасных родаў.**

***— Ці робіцца кесарава сячэнне, калі ў жанчыны каранавірус?***

**А. К.** — Кесарава сячэнне робіцца па медыцынскіх і клінічных паказаннях, а не па жаданні мужа ці самой жанчыны. Праводзіць кесарава сячэнне ў працэсе любога інфіцыравання, у тым ліку і каранавіруснага, не рэкамендуецца. Калі няма паказанняў, лепш, каб жанчына нараджала сама.

### ...А наведванні забаронены

***— Чаму цяпер адменены партнёрскія роды?***

**А. К.** — Партнёрскія роды адменены на перыяд эпідэміі, бо нельга гарантаваць, што партнёр, які прыйдзе, не інфіцыраваны. Як толькі эпідэмія скончыцца, партнёрскія роды адновяцца. Апошнім часам у нас быў вольны рэжым наведвання нашых радзільных стацыянараў. Яны былі адкрыты для ўсіх — для татаў, бабуль і іншых блізкіх. Цяпер гэтыя наведванні забаронены. Але жанчына не так доўга знаходзіцца ў стацыянары, і падчас выпіскі ўсе могуць убачыць і яе, і немаўля і забраць дадому. Як і раней, пры жаданні жанчына за дадатковую плату можа быць размешчана ў аднамеснай палатай павышанай камфортнасці.

***— Ці выпішуць з раддома дзіця, калі ў маці каранавірусная інфекцыя?***

**А. К.** — Калі ў мамы каранавірус, то пасля нараджэння дзіця праводзяць тэст на першыя і другія суткі пасля родаў. Калі два тэсты на COVID-19 адмоўныя, то на трэція суткі малое могуць выпісаць да здаровых блізкіх, якія знаходзяцца дома. Калі за нованароджаным няма каму прыглядзець, яго пераводзяць у 3-ю бальніцу для назірання. Калі першы ці другі тэст паказвае, што ў дзіцяці каранавірус, мама застаецца лячыцца ў бальніцы разам з малым.

**Алена КРАВЕЦ.**

На добрую справу

# Растэрміноўка на ЭКА без пераплат

**Банк Дабрабыт першы ў Беларусі пачаў выдаваць растэрміноўку на працэдуру экстракарпаральнага апладнення (ЭКА). Будучыя бацькі могуць аформіць яе ў мінскай клініцы.**

Незвычайная растэрміноўка закліканая «палегчыць парам доступ да магчымасцяў дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій і дарыць радасць мацярынства ў атмасферы максімальнага камфорту, выгоды і разумення». Цяпер яе можна атрымаць у сталічнай клініцы рэпрадукцыі і генетыкі EVACLINIC. Грошы выдзяляюцца на тэрмін да шасці месяцаў з магчымасцю датэрміновага пагашэння. Максімальная сума — 10 тысяч рублёў.

Падаць заяўку на афармленне растэрміноўкі можна адразу пасля кансультацыі ў доктара-рэпрадуктолага. Для разгляду заяўкі не трэба рыхтаваць дакументы — дастаткова пашпарта. Працэс разгляду доўжыцца каля паўгадзіны. Аформіць растэрміноўку на сябе можа і муж, калі яго спадарожніца акажацца недастаткова крэдытаздольная.

Пасля праверкі банк заключае крэдытны дагавор і накіроўвае грошы на рахунак медыцынскай установы. Працэнты па растэрміноўцы не налічваюцца. Увесь працэс яе афармлення і заключэння дагавора на выдзяленне грашовых сродкаў адбываецца непасрэдна ў клініцы — спецыяльна наведваць банк для гэтага не патрабуецца.

Акрамя ЭКА, таксама запушчана растэрміноўка на шэраг праграм вядзення цяжарнасці. Яны ўключаюць у сябе больш за дваццаць наведванняў акушэр-гінеколага, шырокі спектр лабараторных аналізаў, некалькі сеансаў ультрагукавой дыягностыкі ды шэраг іншых медыцынскіх даследаванняў. Такую растэрміноўку можна ўзяць па такой жа схеме — адразу на месяцы і без працэнтаў.

Нагадаем, ЭКА — адзін з метадаў лячэння бясплоддзя, прычым найбольш складаны і матэрыяльна затратны. Часцей за ўсё да яго звяртаюцца, калі ўсе астатнія спосабы ўжо выпрабаваныя і не далі жаданага выніку. У нашай краіне першае дзіця, зачатае шляхам экстракарпаральнага апладнення, нарадзілася ў 1995 годзе.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Спяшайцеся павольна...

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

***— Адкрыеце прафесійны сакрэт, чаму жанчын сярод кіроўцаў тралейбусаў шмат, а сярод кіроўцаў аўтобусаў — практычна няма?***

**Я. М.:** Ужо ёсць, і даволі многа. Прынамсі, у нас у парку яшчэ год таму было чалавек дзесяць, і цяпер бачу ўсе знаёмыя твары, нават некалькі новых. Раней насамрэч жанчын на аўтобус не бралі — але не з-за нейкай там дыскрымінацыі, а таму што машыны былі з ручной каробкай перадач, і работа лічылася фізічна цяжкай. Сёння ўжо аўтаматыка, і аўтобус мала адрозніваецца ад тралейбуса — націскаеш на кнопку і едзеш.

***— Яна, які від транспарту табе бліжэйшы?***

**Я.:** Дакладна не грамадскі. Лепш за ўсё машына, там цёпла і камфортна. Матацыкл? Ну не, не маё. Якая тут рамантыка, калі рызыкуеш галаву скруціць? Але калі б мне давялося быць кіроўцам, то вадзіла б аўтобус. У тралейбусе ўсё марудна, штангі перыядычна падаюць, ты выходзіш, іх папраўляеш і цягнешся далей...

***— Што, на ваш погляд, самае складанае ў рабоце кіроўцы грамадскага транспарту?***

**Я.:** Клапаціцца пра бяспеку пасажыраў. Мала таго што трэба ехаць вельмі асцярожна і сачыць за дарогай, але неабходна і бачыць, што адбываецца ў салоне, і калі раптам камусьці ў транспарце стане дрэнна, трэба спыніцца, аказаць першую дапамогу, выклікаць «хуткую»...

**Я. М.:** У дзяцінстве Яна часта выходзіла са мной на змены і бачыла ў рабоце розныя сітуацыі. У цэлым яна мае рацыю, у прыярытэце — бяспека пасажыраў. А гэта складана, таму што, як бы дыпламатычна сказаць, большасць моладзі і школьнікаў зусім не адукаваная ў плане ўласнай бяспекі. Пра што я? Асабіста назіраў карціну: я рухаюся, паварочваю, часам бывае, што крута, хоць і на невялікай хуткасці, — а падлеткі «расслабляюцца» на салоне на самакаце альбо на роліках, гойсаюць па крэслах, у працэсе, калі дзверы зачыняюцца, выскокваюць вонкі — гульня ў іх такая. Альбо стаяць, табе ў кабіну грукаюць акурат пад надпісам «не адцягвайце ўвагу кіроўцы падчас руху», ім весела. Па шчырасці, не помню, каб у маім дзяцінстве і юнацтве былі такія забавы. З аднаго боку, злуюся, нават страшна становіцца за іх, З другога — разумею, што гэта дзеці. Калі езджу па маршрутах, дзе ёсць школы, — літаральна малюся, каб толькі чаго не выкінулі. Бывае, выходжу ў салон і тлумачу, што гуляць уласнымі жыццямі — так сабе ідэя. Калі даходліва расказаць, разумеюць умомант!



Карыстаючыся магчымасцю, асобнае «прывітанне» Яўген Галушка перадае аматарам спыніць аўтамабіль акурат на прыпынку грамадскага транспарту, якія ствараюць аварыйныя сітуацыі і перашкаджаюць і кіроўцам, і пасажырам: «Такім людзям цяжка растлумачыць, што іх «я на хвілінанчку» — для нас вельмі многа, а для пасажыраў — матуль з калясакамі, пажылых і нямоглых, людзей з кійкамі і тым больш у інваліднай калясцы — вельмі нязручна!»

**«Любімая байка — пра «спячых паліцэйскіх»: у дзяцінстве я была ўпэўненая, што гэта рэальныя людзі, якія ляжаць на тратуары, і прасіла бацьку не пераехаць кагосьці выпадкова».**

***— Пра раздражняльныя фактары на дарозе можна гаварыць бясконца. Але на плане ў нас пытанне пра пазітыў. Што самае прыемнае ў прафесіі кіроўцы?***

**Я.:** Што гэтая работа дазваляе добра вывучыць горад, даведацца пра новыя дарогі. Ты раз, другі праехаў па маршруце — і ведаеш, як у пэўнае месца даехаць ці выбрацца адтуль, а іншыя людзі будуць шукаць па карце ці блукаць з навігатарам, і не заўжды паспяхова.

***— Новыя дарогі — гэта добра, але нічога, што з часам адны і тыя ж маршруты надакучваюць?***

**Я.:** Ну, тату ж не надакучыла, так?



**Я. М.:** Як ні дзіўна, сапраўды работа кіроўцы надакучыць не можа. Нават на адным і тым жа маршруце абстаноўка змяняецца ў залежнасці ад часу, пары года, знешніх умоў. Так, каб ехаў і засынаў ад нудоты, практычна не бывае — наадварот, звычайна час ляціць незаўважна.

***— А бывае, што пасажыры пішуць падзякі, ці часцей усё ж скаргі?***

**Я. М.:** Па-рознаму. У мяне скаргі былі, прычым, шчыра прызнаюся, абгрунтаваныя (прадбачу пытанне — і ў ДТЗ трапляў па розных прычынах, у тым ліку сам бываў вінаваты). Але ў асноўным дзякуюць. Бачыш, што камусьці цяжка выйсці, — дапамагаеш альбо пачакаеш чалавека, задняя дзверы прытрымаеш, а пасажыр не палянуецца і прыйдзе да кабіны, усміхнецца, скажа дзякуй, і табе ўдвая прыемна: і што добрую справу зрабіў, і што яе ацанілі. А калі гаворка пра матэрыяльную ацэнку, прэміі — гэта далёка не самае важнае, перадусім трэба выконваць сваю работу так, каб скаргаў не было.

***— У кожным аўтобусе і тралейбусе адразу за кабінай кіроўцы вісяць правілы паводзін пасажыраў у грамадскім транспарце. Помніце, што катэгарычна нельга рабіць?***

**Я.:** Бегаць, скакаць па салоне.

**Я. М.:** А самае галоўнае якое правіла, прыгадаеш? Пачытай абавязкова. Не адцягваць увагу кіроўцы падчас руху!

**Я.:** Нервы вадзіцеля важнейшыя за ўсё. Бо я чула абурэнні некаторых жанчын: маўляў, я спазнюся, мяне з-за вас звольняць... А што рабіць, напрыклад, калі ў аўтобус ударылася машына, адбылося ДТЗ? Нічога, чакаць наступны аўтобус. Ну спозніцеся — растлумачыце свайму кіраўніцтву, што трапілі ў аварыю, бываюць такія непрадказальныя рэчы. Але яны не вартыя таго, каб псаваць настрой сабе і іншым.

***— Якім правілам дарожнага руху цябе навучыў тата?***

**Я.:** Пераходзіць на зялёнае святло, па «зебры», абавязкова глядзець налева-направа... Таксама пастаянна, калі едзем сям'ёй на машыне, тата расказвае пра розныя дарожныя знакі — што яны абазначаюць.

**Я. М.:** Я і вадзіць дзяўчат навучу. Старэйшая дачка, ёй шаснаццаць, яшчэ летась выявіла жаданне паспрабаваць сесці за руль, паціху паказваю ёй, што да чаго, нараканняў няма.

**Я.:** Дарэчы, я таксама хачу задаць пытанне тату. Звярнула ўвагу, у аўтобусе была пазначана ўмяшчальнасць — 33 крэслы, 170 чалавек. Гэта як?!

**Я. М.:** Ты што, ніколі не бачыла, як у гадзіну пік уваходзяць пасажыры? Спачатку самыя спрытныя, потым усе астатнія, потым самыя худзенькія, а потым бабуля з кійком усіх рассуне і пройдзе да свайго крэсла. Калі на дварэ лета, людзі больш раздзетыя, чым апранутыя, і ведаюць, што наступнага аўтобуса паўгадзіны не будзе, — у двухсекцыйны аўтобус не тое што 170, усе 200 чалавек увойдуць, утрамбуюцца да такой шчыльнасці, што за парэнчы можна нават не трымацца. (Між іншым, вы ведалі, што ўмяшчальнасць пасажырскіх аўтобусаў вызначаецца з разліку размяшчэння пяці чалавек на адзін квадратны метр плошчы? — **«СГ».**)

***— Ці ёсць у кожнага з вас любімая мадэль аўтобуса?***

**Я. М.:** Напэўна, МАЗ-105 — ён даволі стары, але надзейны, высока сядзіш і добра бачыш дарогу.

**Я.:** Мне падабаюцца аўтобусы з «гармонікам» — калі стаіш на сярэдняй круглай пляцоўцы, яна так класна круціцца на паваротах!

***— Кіроўца — гэта прэстыжная прафесія сёння?***

**Я.:** Патрэбная — так. Але прэстыжная — наўрад ці, у наш час людзі шукаюць лягчэйшага спосабу зарабіць грошы або рвуцца ў блогеры, айцішнікі і ўсё такое.

***— У кожнага вадзіцеля ёсць тысяча і адна дарожная байка. Якія ў вас любімыя?***

**Я.:** Едзем мы з татам, едзем, прыязджаем на дыспетчарскую станцыю, а ў салоне чалавек спіць, відавочна нецвярозы. Тата яго будзіць, кажа: выходзь, дзядзька, прыехалі, той нешта мармыча, выходзіць з аўтобуса. Бачым — пераходзіць на другі бок вуліцы, сядае ў іншы аўтобус і... зноў засынае. А яшчэ мая асабістая любімая байка — пра «спячых паліцэйскіх»: у дзяцінстве я была ўпэўненая, што гэта рэальныя людзі, якія ляжаць на тратуары, і прасіла бацьку не пераехаць кагосьці выпадкова.



**Я. М.:** Лепш за ўсё запомнілася, як на другі год работы на тралейбусе ўпершыню трапіў у ДТЗ. Аб'язджаў дзядулю-веласіпедыста, але той у мяне ўрэзаўся, упаў, ускочыў і давай пагражаць, маўляў, ты папаў. Паколькі я сам тады быў кіроўца малады і нявопытны, то пагадзіўся, што вінаваты. На цяперашні розум ведаю, што дзядуля парушаў правілы, бо ехаў далёка не за метр ад краю праезнай часткі, а неяк наўскос... У любым выпадку, гэта такі вопыт, які пайшоў на карысць. Хоць з веласіпедыстамі дагэтуль баюся знянацку сустрэцца — асабліва з таго часу, як ім дазволілі перасякаць дарогу не спешваючыся: многія ляцяць, не глядзяць па баках.

***— Калі апісаць прафесію ў трох словах, гэта будуць словы...***

**Я.:** Галоўны. Цярплівы, у сэнсе стрэсаўстойлівы. М-м, што б яшчэ? Харошы?

**Я. М.:** Паслухаў Яну і чамусьці «Майдадыра» згадаў, «умывальнікаў начальнік і мачалак камандзір». Насамрэч складана засяродзіцца толькі на трох словах — назаву тыя рэчы, якія неабходны на мой асабісты погляд. Гэта будуць дысцыпліна (маю на ўвазе і самакантроль, устрыманне ад алкаголю, і ўменне сябе трымаць у руках у любой сітуацыі), увага (бо на дарозе абставіны бываюць самыя непрадказальныя, рух у Мінску ўсё больш напружаны, і варта адвесці позірк усяго на секунду — хоп, амаль што аварыйная сітуацыя) і... напэўна, шанцаванне. Без яго, я лічу, нікуды, бо здараецца, чалавек акуратны, уважлівы на дарозе, правілы ведае і выконвае, а яму не шанцуе: то машыны ламаюцца, то бясконцыя затрымкі ў дарозе. Дарога — яна такая, каго любіць, а каго не. Усё астатняе, у прынцыпе, можна вывучыць і дасведчыць навыкі да аўтаматызму.

**Гутарыла Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**



Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки»,** **г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| Продавец | **ГЛХУ «Червенский лесхоз»,** **223232, ул. Барыкина, 16, г. Червень, Минская обл., +375 1714 52384** |

**Предмет аукциона:**
**транспортные средства, спецтехника, бывшее в употреблении.**
**Месторасположение:**
**Минская область, г. Червень, ул. Ленинская, ПМУ «Загорье»**

| Лот № | Инв. номер | Наименование | Начальная цена, с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | 01243948 1242388 | Автомобиль грузовой специальный сортиментовоз МАЗ-630308 (рег. знак АЕ 0224-5), 2007 г. в. с гидроманипулятором ПЛ 70.01 | **19 761,73** |
| 2 | 01255181 | Прицеп специальный сортиментовоз МАЗ-837810 (рег. знак А6971 В-5), 2011 г. в. | **3 770,72** |
| 3 | 01244701 01243913 | Автомобиль грузовой специальный сортиментовоз МАЗ-6303А8-328 (рег. знак АІ 6263-5), 2009 г. в. с гидроманипулятором ОМТЛ 70.04 | **15 955,34** |
| 4 | 01254655 | Прицеп специальный сортиментовоз МАЗ-837810 (рег. знак А2422 Е-5), 2009 г. в. | **2 803,73** |
| 5 | 01244289 01244716 | Автомобиль грузовой специальный сортиментовоз МАЗ-6303А8 (рег. знак АЕ 9558-5) 2008 г. в. с гидроманипулятором М-75.04 | **20 950,44** |
| 6 | 01254056 | Прицеп специальный сортиментовоз МАЗ-837810 (рег. знак 9248 АА-5), 2007 г. в. | **2 692,72** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на счет BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390. Срок внесения задатка по 15.06.2020 г.

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона:** если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения торгов,** оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также информация о порядке и сроках возмещения затрат на организацию и проведение торгов указаны в условиях проведения торгов, определенных в Положении о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденном постановлением Совета Министров РБ от 12 июля 2013 г. № 609, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by. Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения в любое время, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время проведения аукциона: 17.06.2020 в 12.00** по адресу: ГЛХУ «Червенский лесхоз», 223232, ул. Барыкина, 16, г. Червень, Минская обл.
**Дата и время окончания приема документов: 15.06.2020** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Контактные телефоны**: +375 (17) 280-36-37; +375 (44) 704-92-06.
— Пра сумесную работу над «Блакаднай кнігай» напісана і расказана шмат, — кажа дачка пісьменніка Наталля Адамовіч. — Я паспрабавала пераасэнсаваць, што звязвала іх, — кнігі, лісты, фота, дароўныя надпісы, водгукі... Гранін быў старэйшы за тату на сем гадоў. Ваяваў у Ленінградскай стралковай дывізіі народнага апалчэння, на Лужскім рубяжы, ва Усходняй Прусіі. Алесь Адамовіч правёў вайну ў падполлі, год быў у партызанах. Гранін па адукацыі інжынер-электрык, тата — філолаг. У Граніна першая менавіта ваенная проза выходзіць у сярэдзіне 60-х, у Адамовіча — у пачатку: «Вайна пад стрэхамі» (1960) і «Сыны ідуць у бой (1963) — пра вайну ў пасёлку Глуша. Пазней па дылогіі таты былі зняты аднайменныя фільмы з песнямі, якія спецыяльна напісаў для іх Уладзімір Высоцкі. Амаль ва ўсіх творах вайна паказана вачыма 14—17-гадовага падлетка. Гранін пражыў 98 гадоў, тата пайшоў з жыцця на 68-м годзе. «Мы з ім былі ледзь знаёмыя. Дзесьці я яго бачыў, на нейкіх пісьменніцкіх сустрэчах, нешта мы гаварылі», — згадваў Гранін да таго, як яны пачалі працаваць над сумеснай кнігай. «Акрамя Фёдара Абрамава, з якім знаёмы яшчэ з 1950 года, бліжэй за іншых ленінградцаў ведаў Даніїла Граніна, але больш завочна — па творах яго, цудоўным эсэ і праз кароткую перапіску (якраз з нагоды яго эсэ пра Пушкіна і Булгарына)», — пісаў у сваіх нататках Алесь Адамовіч.

Па-сапраўднаму іх збліізіла «Хатынская аповесць», якая выйшла ў часопісе «Дружба народаў» у 1972 годзе. Гранін прыйшоў ад яе ў захапленне. «Прачытаў Вашу аповесць не адрываючыся. І ненавідзеў, і пакутаваў, успамінаючы ўласную вайну, такую ж страшную... Усё ўспамінаў, таму што пазнаваў. І вашу-нашу ленінградскую

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

нішчымніцу. І многае, чаго не было ў маёй вайне, франтавой. І радаваўся за Вас, за таленавітасць — прыміце гэтае слова без сарамлівасці, гэтак жа як я без сарамлівасці, без перабольшання пішу яго — таленавітасць. Дзівіць вобразнасць, тонкасць псіхалагічных знаходак, ды і не толькі псіхалагічных, а нейкіх асаблівых... Здаецца, столькі ўжо прачытана кніг пра партызанаў, столькі было фільмаў, вось з'явілася яшчэ адна праўда, і нічога падобнага, і чытаем без параўнання, быццам першая кніга пра гэта... Віншую Вас», — напісаў тады ў сваім лісце да Адамовіча расійскі пісьменнік. А потым выйшла яго рэцэнзія на кнігу ў часопісе «Новый мир». «Рэцэнзія — не мой жанр, — прызнаваўся ён. — Але аповесць мяне вельмі ўсхвалявала. У ёй былі бязлітаснасць, сумленнасць і тое асаблівае бачанне вайны, якое можа быць толькі ва ўдзельніка нявыдуманых падзей...»

## «Найлепшаму суаўтару Савецкага Саюза...»

Упершыню блакадныя гісторыі Алесь Адамовіч пачуў у 1973 годзе, калі прыязджаў у Ленінград да сям'і расстралянага беларускага класіка Максіма Гарэцкага. Яму іх расказала дачка Гарэцкага — Галіна. А пасля таго як у 1974 годзе прачытаў аповесць Даніїла Граніна «Гэтае дзіўнае жыццё» пра вучонага Аляксандра Любішчава, які шкадаваў, што «амаль няма дзённікаў ленінградскай блакады», напісаў Граніну ліст з прапановай выправіць гэтую несправядлівасць. Адамовіч згадаў пра толькі што выдадзеную ў суаўтарстве з Брылём і Калеснікам кнігу «Я з вогненнай вёскі» і падзяліўся думкамі наконт таго, якой ён бачыць ленінградскую. Даніїл Аляксандравіч адразу адгукнуўся: так, усё дакладна, але дзе знайсці час на такую працу? «Я прапанаваў яму (Адамовічу. — **Аўт.**) іншых суаўтараў — літаратара, журналіста, — пісаў у сваіх успамінах Даніїл Гранін. — Ён быў мілы з імі і... працягваў вербаваць мяне. Ён даказваў, што справа гэта не журналісцкая, а пісьменніцкая».

«Я ўсё яшчэ сумняваўся, ніколі не меў суаўтара: як гэта пісаць удвaіх? — разважаў Гранін. — Шмат чаго было супраць сумеснай




Блакадная кніга збліізіла двух пісьменнікаў.

работы. Да таго ж сядзеў над раманам. Чаму я пагадзіўся? Потым я зразумеў: мне спадабаўся Адамовіч, вырашыла яго абаянне, якое ён шчодра раздаваў, прыцягваючы мяне. Яму ўдалося прывабіць мяне сваім натхненнем, захапленнем перад Ленінградам і яго жыхарамі. Адразу кінуліся ў работу, разумеючы, што трэба рабіць не адкладаючы — памяць сыходзіць і людзі сыходзяць. Уражвала яго смеласць: горада не ведаў, не ведаў блакады, людзей. Пасяліўся ў Ленінградзе, зняў пакой, купілі яму магнітафон». «Найлепшаму суаўтару Савецкага Саюза», — напісаў для Адамовіча на часопісе «Аўрора», дзе выйшла другая частка іх агульнага твора, удзячны Даніїл Гранін. Гэтая кніга стала бомбай, такой праўды не чакалі ў Савецкім Саюзе. Але нават у старанна «вычышчаным» варыянце яна была бязлітасная ў сваім уздзеянні на чытача.



На прэзентацыю «Блакаднай кнігі» немцы раскупілі ўсе білеты.

## Глядзець без слёз на гэта немагчыма

Алесь Адамовіч пайшоў з жыцця ў 1994 годзе, Даніїла Граніна не стала ў 2017 годзе. Сёння захаваннем памяці і папулярызацыяй творчасці бацькоў займаюцца іх дочкі — Марына Даніілаўна і Наталля Аляксандраўна. Летась у Санкт-Пецярбургу прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя 40-годдзю кнігі, 100-годдзю Даніїла Граніна і 75-годдзю зняцця блакады. На іх была запрошана і Наталля Адамовіч. Так супала, што гэта адбылося ў той год, калі споўнілася 25 гадоў са дня смерці Алеся Адамовіча.

— У верасні ў Пецярбургскім музеі палітычнай гісторыі Расіі адкрылася ўнікальная выстаўка «Людзі хочуць ведаць», — расказвае Наталля. — На ёй упершыню былі паказаны сакрэтныя дакументы, якія спынілі часопісную публікацыю «Блакаднай кнігі». Факты ўражваюць. Савецкая цэнзура нават у дзённіку паміраючага хлопчыка Юры Рабінкіна знайшла шмат чаго шкоднага для савецкіх людзей. З «Блакаднай» выкрэсліваліся цэлыя старонкі, у тым ліку і аўтарскі тэкст, дзе былі словы аб тым, што праўду пра блакаду яшчэ трэба напісаць гісторыкам будучыні.

Выстаўка моцная па ўздзеянні, кожны прадмет кажа сам за сябе. Адзін з экспанатаў — дзверы камунальнай кватэры з мноствам званкоў. З другога яе боку — фатаграфіі жыхароў. Калі пазваніць у званок, у навушніках гучаць галасы расказчыкаў, якіх ужо няма ў жывых. Шмат тут рэдкіх дакументальных сведчанняў. Вельмі цікавы дакумент — ліст Граніну ад загадчыка аддзела гандлю ленінградскага гарвыканкама Івана Андрыенкі, дзе ён расказвае пра змены хлебных нормаў і прыводзіць дакладную лічбу блакадных ахвяр, але просіць яе не публікаваць. Афіцыйная колькасць загінулых ленінградцаў, па інфармацыі дзяржархіва Расійскай Федэрацыі, у 1970 годзе складала 641 803 чалавекі. Іван Андрыенка кажа пра 900 тысяч. І гэта адпавядае той інфармацыі, якую паведамляў маршал Жукаў, — каля мільёна чалавек.

— Гледзячы на ўсё гэта, разумееш, наколькі важныя рэчы захавалі для нашчадкаў Алесь Адамовіч і Даніїл Гранін, — кажа Наталля. — Я вельмі ўдзячна пісьменніцы Наталлі Сакалоўскай, стваральніцы выстаўкі. Яна шмат займалася тэмай блакады, рыхтавала да друку дзённікі Вольгі Бергольц, вывучала ў архівах гісторыі блакаднікаў. Гэтая выстаўка павінна была прыехаць сёлета ў Мінск. Але з-за складаных эпідэміялагічных абставін усё давялося адкласці на потым.

## Боль душы лечыцца праўдай

Неверагодна, але сёння «Блакадная кніга» карыстаецца неймавернай папулярнасцю ў Германіі. І на тое ёсць прычына. На захадзе краіны доўгі час пра блакаду наогул нічога не ведалі — толькі пра Сталінград. 27 студзеня немцы адзначаюць Дзень памяці ахвяр нацыянал-сацыялізму, і, калі яны даведаліся пра блакаду і тое, што яна была знятая менавіта 27 студзеня 1944 года, запрасілі да сябе на гадзіну памяці Даніїла Граніна. Гэта было ў 2014 годзе. Прадбачлівыя арганізатары сустрэчы паставілі для 95-гадовага пісьменніка крэсла за трыбунай. Але ад прапановы прысесці ён цвёрда адмовіўся і амаль гадзіну выступаў стоячы. Яго прамова была настолькі жорсткая і выкрывальная, што немцы былі ў шоку. «Нямецкія войскі, па сутнасці, вельмі камфортна, без асаблівых намаганняў чакалі, што надыходзячы голад — наёмны забойца — і маразы прымусяць горад капітуляваць, спрабавалі ператварыць жыхароў Ленінграда ледзь не ў звяроў», — кляйміў ён захопнікаў. Сцены бундэстага ўпершыню ў гісторыі чулі такія рэзкія абвінавачванні. У зале знаходзіліся прадстаўнікі кіраўніцтва Германіі, у тым ліку і Ангела Меркель. Словы Даніїла Граніна ўзрушылі ўсіх. Пасля гэтай прамовы тэма блакады стала нагодай для вывучэння і аналізу ў немцаў, а «Блакадная кніга» на гэтым фоне — сапраўдным адкрыццём.

Летась Наталля і дачка Граніна Марына атрымалі запрашэнне ў Берлін — на прэзентацыю поўнага перакладу «Блакаднай кнігі». Яна праходзіла ў Акадэміі мастацтваў, і на яе прыйшло болей чым тысяча немцаў. Прычым не бясплатна, а за грошы. Усе білеты былі раскупленыя. Нямецкія пісьменнікі дзве гадзіны запар чыталі ўрыўкі з «Блакаднай кнігі» — з дзённікаў Юрыя Рабінкіна, акадэміка Князева, іншых блакаднікаў, якія сведчылі, што голад здольны праглынуць і сілу, і волю, і сумленне, і саму здольнасць супраціўляцца смерці... У зале стаяла мёртвая цішыня. Трэба было бачыць твары людзей і хваляванне, з якім яны ўсё гэта слухалі.

«Боль душы лечыцца праўдай, — пісаў у сваіх нататніках Алесь Адамовіч. — Вялікай праўдай і ўвагай чалавечай... Хтосьці сказаў: чалавек такі, наколькі ён здольны, колькі можа пачуць пра сябе, панесці праўды... Пра вайну ўсю праўду ведае народ — гэтае выказванне Канстанціна Сіманава становіцца афарызмам. Яе спазнаць — праз памяць народную — імкнуцца многія. Менавіта ўсю праўду. Ёсць, ёсць яна ў гісторыі кожнага народа, ухіляцца ад яе — на шкоду сабе, маральнаму здароўю народа на шкоду. Не хачу, гэта мне, нам непрыемна, «соль на раны» і таму падобныя мудрагельствы, толькі б не ўспамінаць і не ведаць, — не аблягчэнне, не, гэта значыць нагружаць і душу, і гісторыю новай няпраўдай, хлуснёй. Чалавек рана ці позна пажадае ад гэтага вызваліцца...»

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва Наталлі АДАМОВІЧ.**

**Збор сродкаў на музей Алеся Адамовіча ў Глушы працягваецца. Далучыцца да добрай справы можаце і вы. Разліковы рахунак існуе пры аддзеле ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Бабруйскага райвыканкама.**

**Р/р BY84AKBB364212927 23267100000 у філіяле 703 ААТ «ААБ Беларусбанк», БІК AKBBBY21703, УНП 701226324.**

**Прызначэнне плацяжу: «Для вырабу праектна-каштарыснай дакументацыі і рэканструкцыі будынка ў пасёлку Глуша пад музей А. Адамовіча». Гэты доўгі сказ павінен быць пазначаны ў банкаўскім дакуменце абавязкова.**

## О РЕАЛИЗАЦИИ ИМУЩЕСТВА ЗАО «Могилевская швейная фирма «Вяснянка»

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | ООО «Могириус» – антикризисный управляющий в деле о банкротстве ЗАО «Вяснянка» УНП 790956888 (212030, г. Могилев, ул. Ленинская, 91) |
| **Продавец** | ЗАО «Могилевская швейная фирма «Вяснянка»: 212030, г. Могилев, ул. Ленинская, 91, УНП 700008631 |
| **Форма, дата, место и время начала проведения торгов** | Открытые торги в форме аукциона. Дата: **28 мая 2020 года**. Место: г. Могилев, ул. Ленинская, 91. Время: 12.00 |
| **Сведения о предмете торгов, порядок ознакомления с ним** | Лот № 1: предприятие как имущественный комплекс (ПИК) ЗАО «Могилевская швейная фирма «Вяснянка». Рег. номер 0001400, свидетельство № 3498 от 19.09.2019. Состав имущества и имущественных прав размещен на сайте www.bankrot.gov.by. Ознакомиться с предметом торгов можно по адресу: г. Могилев, ул. Ленинская, 91 в рабочие дни с 9.00 до 16.00 |
| **Начальная цена предмета торгов** | Лот № 1: **4 009 050,00** бел. руб. Без учета НДС, согласно п.п. 2.30.1 ст. 115, Налогового кодекса Республики Беларусь (Особенная часть) |
| **Порядок проведения торгов** | Имущество считается проданным лицу, которое предложило на торгах самую высокую цену. Шаг торгов – 5 % от стоимости лота. В случае если торги признаны несостоявшимися, предмет торгов продается единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (либо явившемуся для участия в них) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол аукциона. Оплатить предмет торгов в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи. Организатор торгов вправе отказаться без объяснения причин от проведения торгов, но не позднее чем за 5 дней до даты их проведения |
| **Размер, порядок и сроки внесения задатка, сроки приема заявок на участие в торгах и прилагаемых к ним документов** | Сумма задатка для участия в торгах – 10 % от начальной стоимости лота. Сумма задатка в срок до 27.05.2020 (включительно) вносится в бел. руб. на р/с BY28BLBB30120700008631001005 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Могилевской области, г. Могилев, ул. Первомайская, 29АБИК BLBBBY2X, УНП 700008631, получатель платежа – ЗАО «Могилевская швейная фирма «Вяснянка». Назначение платежа – задаток для участия в торгах по продаже ПИК ЗАО «Могилевская швейная фирма «Вяснянка». Заявка на участие в торгах и прилагаемые к ней документы принимаются **в срок до 16.30 27.05.2020** по адресу: 212030, г. Могилев, ул. Ленинская, 91. К заявке прилагаются: платежный документ с отметкой банка о внесении задатка; копии документов, подтверждающих юр. полномочия участников торгов: для юр. лиц – копия свидетельства о госрегистрации; доверенность, выданная представителю юр. лица (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель), для ИП – копия свидетельства о госрегистрации ИП; для физ. лица – копия паспорта. Заявки, поступившие после установленного срока, рассмотрению не подлежат. Сроком поступления заявки является дата его регистрации в журнале регистрации заявок на участие в торгах. Более подробную информацию о порядке проведения торгов можно узнать в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по тел.: 8029 683-74-83, 8029 388-80-18 |
| **Возмещение затрат** | Возмещение затрат на организацию и проведение торгов производится победителем аукциона по фактическим затратам (расходы на проведение аукциона; расходы на проведение оценки имущества, выставленного на торги; расходы, связанные с регистрацией договора купли-продажи). Победитель торгов обязан перечислить на расчетный счет продавца сумму фактических затрат в течение 5 дней со дня проведения торгов |
| **Порядок заключения договора и уплаты цены предмета торгов** | Срок подписания договора купли-продажи – 15 рабочих дней после торгов. Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов |

## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении 26.05.2020 повторного аукциона по продаже недвижимости в г. Шклове (цена снижена на 45 %)

Лот № 1: **капитальное строение с инв. № 725/С-15697 – административное здание,** общей площадью 74,7 кв. м. Составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное административное здание с пристройкой, отмосткой. **Капитальное строение с инв. № 725/С-17747 – станция технического обслуживания автомобилей,** общей площадью 3205,6 кв. м. Составные части и принадлежности: станция технического обслуживания автомобилей с подвалом, уборной, асфальтовым покрытием, воротами въездными, воротами металлическими, забором кирпичным, ограждением, двумя отстойниками, эстакадой. **Капитальное строение с инв. № 725/С-15635 – здание мойки,** общей площадью 221,9 кв. м. Составные части и принадлежности: двухэтажное кирпичное здание мойки. **Капитальное строение с инв. № 725/С-17815 – кабельная линия АВВГ 3х35+0,** составные части и принадлежности: две кабельные линии АВВГ 3х35+0. Лот № 1 расположен по адресу: Могилевская обл., Шкловский р-н, г. Шклов, ул. 70 год Великой Перамоги, 56А, 56А/1, 56А/2. Сведения о земельном участке: кадастровый номер: 725850100001003416, площадь – 1,4678 га (право постоянного пользования), целевое назначение земельного участка: земельный участок для размещения объектов административного назначения.

**Начальная цена продажи: 324 119,40 бел. руб. с учетом НДС**
**Сумма задатка: 32 411,94 бел. руб.**

**Аукцион состоится 26 мая 2020 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Прием заявлений: по 25.05.2020 до 15.00 в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее чем за три дня до даты аукциона

**Продавец:** ОАО «Шкловский льнозавод», 213004, г. Шклов, ул. Льнозаводская, 1, УНП 700015065

**Расчетный счет для внесения задатка:** получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата предмета аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты предмета аукциона

Информация о предыдущих аукционах была опубликована в номерах газеты «Звязда» 27.11.19, 07.02.2020, 12.03.20

Организатор аукциона**: Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by

Доп. информацию можно получить по тел.:
**+375222-72-41-14, +37529-624-26-25, +37529-550-09-56**
и на сайте **ino.by**

И З В Е Щ Е Н И Е  О  П Р О В Е Д Е Н И И  А У К Ц И О Н А

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ДКУП «Расчетно-кассовый центр Борисовского района» (продавец)**

## ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ

| | |
|---|---|
| Наименование объекта | **Часть нежилого помещения, расположенного в здании мастерских, общей площадью 115,0 кв. м (инв. № 610/С-57490). Характеристика здания мастерских:** одноэтажное блочное здание 1995 года постройки |
| Местонахождение объекта | Минская обл., г. Борисов, ул. Строителей, 30 |
| Общая площадь, кв. м | 115 |
| Срок договора аренды | 5 лет |
| Начальная цена права заключения договора аренды, бел. руб. | 513,19 |
| Сумма задатка, бел. руб. | 51,00 |
| Размер ежемесячной арендной платы за сдачу в аренду Объекта | 86,25 базовой арендной величины |
| Условия (при наличии) продажи Объекта аукциона | Для осуществления хозяйственной деятельности |

Базовая арендная величина с 01.04.2020 составляет 17,85 бел. руб. В соответствии с подпунктом 2.1 пункта 2 Указа Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 № 150 «О некоторых вопросах аренды и безвозмездного пользования имуществом» размер базовой арендной величины ежегодно устанавливается Советом Министров Республики Беларусь с учетом изменения индекса потребительских цен за предыдущий год по отношению к предшествующему и применяется с 1 апреля года, в котором он установлен.

**Задаток в размере 10 % от начальной цены объекта, перечисляется на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан перечислить арендодателю сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.

Договор аренды имущества должен быть заключен в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона регламентирован Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049, а также иными актами законодательства. Аукцион состоится **15.06.2020** в **11.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **12.06.2020** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: 8 (017) 207-71-34, 8 (029) 102-21-17, сайт в сети интернет: www.rlt.by**

УНП 692096580.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА (ПОНИЖЕНИЕ ЦЕНЫ НА 50 %) ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «СЛОНИМСКИЙ ВОДОКАНАЛ»

| Предмет торгов, краткая характеристика | Начальная цена с учетом НДС | Сумма задатка (5 %) |
|---|---|---|
| **Лот № 1 – капитальное строение с инв. № 450/С-18838** (здание нежилое) с пристройкой и террасой, кирпичное, 2 этажа, 1953 г. п., площадью 240,3 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 425450100001007537 площадью 0,0988 га для обслуживания здания, право постоянного пользования (Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Советская, д. 7) | **37 002 руб. 67 коп.** | 1 850 руб. 00 коп. |
| **Лот № 2 –** аппарат отопительный газовый марки АОГВК-23,2-1, заводской номер 13292, инв. № 8121 | **204 руб. 00 коп.** | 10 руб. 00 коп. |
| **Лот № 3 –** автоматическая пожарная сигнализация на базе ПКПА-6-06, инв. № 8122 | **198 руб. 00 коп.** | 10 руб. 00 коп. |
| **Торги состоятся 05 июня 2020 года в 14.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | |
| Срок подачи документов для участия в торгах | **по 01 июня 2020 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | |

Аукцион без условий. Шаг аукциона 5 процентов. **Сведения о продавце:** ОАО «Слонимский водоканал», 231800, Гродненская обл., г. Слоним, ул. Пушкина, 120, тел. 8 (01562) 66030. **Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка**: Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8 (0152) 621632, счет BY65BLBB30150500481906001002 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., код BLBBBY2X , УНП 500481906. **Срок заключения договора:** в течение 10 календарных дней после проведения торгов. **Условия оплаты:** в течение 10 календарных дней с момента подписания договора. Условия участия и порядок проведения аукциона на сайте www.fincentr.by. Более подробная информация по тел. в Гродно 8 (0152) 621632. Предыдущие публикации: газета «Звязда» от 22.10.2019 г., 03.03.2020 г.

## Извещение об открытом аукционе по продаже права проектирования и строительства капитального строения (ул. Дубко, ул. Буденного, 42-44) в городе Гродно 23 июня 2020 года

| № п/п | Месторасположение земельного участка | Площадь земельного участка, га, срок аренды | Целевое назначение земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, рублей | Наличие обременений | Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельного участка и сносом расположенных на нем объектов недвижимости, рублей |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1. | г. Гродно, ул. Дубко | 1,0162, 5 лет | Комплекс административно-общественного назначения со встроенно-пристроенными объектами обслуживания – здания по индивидуальному проекту переменной этажности от 2 до 5 этажей с подземным (встроенным, пристроенным) паркингом | 13 285,0 | 1 328,5 | 7 231,6 | Снос капитальных строений по ул. Дубко А.И., д. 11, 11/2, 11/3, 13, пер. Дзержинского, д. 21, перенос (вынос) подземных инженерных коммуникаций, зеленых насаждений (при наличии), попадающих под пятно застройки | 1 438 400,0 |
| 2. | г. Гродно, ул. Буденного, 42-44 | 0,4490, 5 лет | Объект общественного назначения – здание по индивидуальному проекту высотой до 3-4 этажей со скатной крышей | 11 454,0 | 1 145,4 | 4 679,93 | Демонтаж фундаментов капитальных строений, перенос (вынос) подземных инженерных коммуникаций, зеленых насаждений (при наличии), попадающих под пятно застройки | - |

Предмет аукциона: право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на предоставляемом земельном участке, на котором находятся объекты, подлежащие сносу.

По заявлению победителя аукциона может быть предоставлена рассрочка внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка сроком на 1 год.

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462.

Основные требования по проектированию и строительству объекта и условия предоставления земельного участка указаны в земельно-кадастровой и иной документации, подготовленной для проведения аукциона.

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Гродненским горисполкомом).

**Аукцион состоится 23 июня 2020 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1.**

Участниками аукциона могут быть юридические лица или индивидуальные предприниматели. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более индивидуальных предпринимателей, юридических лиц.

Для участия в аукционе необходимо:

внести задаток в размере, указанном в графе 6 таблицы, перечисляемый расчетный счет BY24AKBB30120000418104000000 Главное областное управление № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

- заявление на участие в аукционе;
- документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка;
- подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;
- дополнительно представляется: индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык; консолидированными участниками для участия в аукционе не представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

При подаче документов на участие в аукционе представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

При подаче документов уполномоченное лицо, которое будет представлять на аукционе стороны договора о совместном участии в аукционе и подписывать протокол о результатах аукциона, (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющей личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями, юридическими лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, кабинет № 407, в рабочие дни **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 с 25 мая по 17 июня 2020 года.**

Торги в отношении земельных участков проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, аукцион признается несостоявшимся и земельный участок предоставляется такому лицу при его согласии с внесением платы за право заключения договора аренды земельного участка в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан:

- внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления Гродненским горисполкомом рассрочки ее внесения);
- возместить Гродненскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;
- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре.

Оплата стоимости за право заключения договора аренды земельного участка осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

После внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка Гродненский горисполком заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений).

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по земельным участкам (в том числе с характеристиками расположенных на земельных участках инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии) и условиями инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории). Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Телефоны для справок в Гродно: **(0152) 72-05-37, 72-00-10.**

Адрес сайтов: **Гродненского городского исполнительного комитета http://grodno.gov.by, организатора аукциона http://gcn.by.**

У самаізаляцыі

# Іншы Галівуд

## Як новае кіно прад'яўляе прэтэнзіі старому

**Пра Галівуд галівудскімі ж метадамі — сярод апошніх анлайн-рэлізаў Netflix зацясаўся міні-серыял пра славутую «Фабрыку летуценняў». У сямі серыях з кінашнымі выклікамі, пафаснымі прамовамі, сентыментальнымі сцэнамі, жыццесцвярджальнымі паваротамі і ненатуральна прыгожымі персанажамі расказваецца, як у 1940-х нібыта мянялася амерыканская індустрыя кіно і як яна нібыта мяняла навакольны свет. Фантазіі аўтараў Раяна Мёрфі і Іэна Брэнана агорнуты ў такую ж «штучную» манеру здымак: серыял пра Галівуд — ён так і называецца — «Галівуд» — падкрэслена карыстаецца напрацаванымі патэрнамі і становіцца як бы стылізацыяй пад чарговы масавы прадукт.**



Штука ў тым, каб усе перадавыя трэнды, што апошнім часам сталі гучна заяўляць пра сябе ў грамадстве і кінаіндустрыі, перанесці ў галівудскія студыі другой паловы 1940-х гадоў і змадэляваць, што з гэтага магло б атрымацца. Серыял «Галівуд» — гэта і альтэрнатыўная гісторыя кіно, і адначасова зробленая па канонах камерцыйнага кінапрадукту сюжэцік пра каханне і перамогу праўды. Праўда тут значыць роўнасць паміж мужчынамі і жанчынамі, белымі і чорнымі, гетэрасексуаламі і гомасексуаламі, а таксама адсутнасць харасменту. То-бок серыял з'яўляецца і меседжам, і забаўляльным — больш няма куды — відовішчам.

Як водзіцца, некалькі пачынальнікаў — акцёры, сцэнарыст і рэжысёр — робяць свае першыя крокі ў скарэнні «Фабрыкі летуценняў» і дасягненні сваіх мар. На фоне гучаць імёны Хамфры Богарта, Альфрэда Хічкока, Чарльза Чапліна, у эпізодах з'яўляецца славутая дзякуючы ролі Скарлет О'Хары Віўен Лі, а пакуль нікому не вядомыя хлопцы і дзяўчаты намагаюцца прабіцца ў першыя рады. Канешне, яны натыкаюцца не толькі на канкурэнцыю, але і на несправядлівыя правілы гульні — у прагнілай з пункту гледжання маралі студыйнай сістэме сустракаюцца і строгая мадэль уяўленняў пра свет, і сексуальная эксплуатацыя, і дыскрымінацыя паводле рознага кшталту прыкмет. Што цікава, далікатна ў дачыненні да жанчын у серыяле сексуальна эксплуатуюць толькі мужчын.

Так насамрэч і было — кінастудыямі кіравалі белыя мужчыны, іншыя расы здымаліся хіба што ў эпізадычных ролях, а гомасексуалістаў як бы ўвогуле не існавала. І за зменамі мы назіраем толькі сёння — напрыклад, як «Оскар» атрымлівае стужка «Месячнае святло» пра афраамерыканцаў-геяў, што мела месца ў 2017 годзе, альбо паўднёвакарэйская карціна «Паразіты», што адбылося сёлета. Як Амерыканская кінаакадэмія цярпіць крытыку за тое, што наміную на прэмію амаль выключна белых мужчын. Як неабходнасць перамен дэкларуецца ў цырыманіяльных спічах. Але змены намячаюцца толькі сёння, іншая рэч — кіно, дзе ў відовішчнай форме можна ўявіць усё што заўгодна. Таму серыял свядома мімікруе пад фармат Галівуда, уласна, самага ўплывовага дастаўшчыка ілюзій і маніпуляцый.

У сюжэце ўсё закручваецца вакол кінапраекта пад рабочай назвай «Пэг», з якім гэтыя пакуль невядомыя хлопцы і дзяўчаты ўсё і ўсіх перамогуць. Ад серыі да серыі глядач назірае, як паступова ў Галівудзе развенчваюцца то адны, то другія стэрэатыпы, а эфект замацоўваецца цырымоніяй «Оскар». Калі ў пачатку ў размове з дачкой, якая хоча стаць актрысай, кіраўнік кінастудыі паблажліва выказваецца пра ўсю гэту нізкую тусоўку, то фінальны эпізод «Галівуда» павышае маральны выгляд «Фабрыкі летуценняў» на некалькі ўзроўняў, калі не да бездакорных нябёс.

Новы серыял Netflix у жаданні перапісаць гісторыю Галівуда свядома капіруе яго эстэтыку — выкарыстоўвае класічную мадэль пабудовы канфлікту, толькі напаўняе яго не, скажам, супрацьстаяннем багатых і змагароў за паляпшэнне жыцця бедных, а галасамі тых, хто дагэтуль не адстаяў сваё месца ў галівудскай карціне свету, то-бок жанчын, некаторых рас і геяў. Дарэчы, згодна з чарговым як бы сімвалічным вывертам сюжэт «Пэг» расказвае пра актрысу, якую выразалі з фільма, і ў трагічным фінале яна кінулася з адной з літар знака Hollywood. Праўда, канцоўку нашы героі ў выніку перапісалі, і гэта служыць жыццесцвярджальным жэстам.

Чаго толькі нерэальна-ідэальнага тут не адбываецца — вядома, усе змены, якія пазіцыянуюцца серыялам як правільныя, у фільме прыводзяць да пазітыўных вынікаў. Гэтая манера легкадумнай галівудскай містыфікацыі ўспрымаецца ці то як іронія, ці то як скруха, хоць яркія серыі з натхняльнымі словамі, чырвонымі памадамі і прыгладжаным наваколлем ні разу на гэта не намякнуць.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.08 | 21.05 | 15.57 |
| Віцебск — | 4.52 | 21.00 | 16.08 |
| Магілёў — | 4.58 | 20.55 | 15.57 |
| Гомель — | 5.02 | 20.44 | 15.42 |
| Гродна — | 5.25 | 21.19 | 15.54 |
| Брэст — | 5.32 | 21.12 | 15.40 |

## Месяц

*Апошняя квадра ў 17.02. Месяц у сузор'і Вадаліва.*

## Імяніны

***Пр.*** *Ніны, Тамары, Ерамея, Ігната, Яфіма.* ***К.*** *Марыі, Юстыны, Баніфата, Віктара, Мацея, Міхала.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

**14 МАЯ**

У краіне

**1795** год — выйшаў указ Сената Расійскай імперыі аб стварэнні Мінскай губерні з цэнтрам у Мінску.

**1910** год — нарадзіўся Рыгор Лазаравіч Старобінец, беларускі вучоны-хімік, член-карэспандэнт НАН Беларусі (1969), доктар хімічных навук (1955), прафесар (1956), заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1980). Аўтар больш чым 400 навуковых прац, 60 вынаходстваў.



**1955** год — нарадзіўся Аляксандр Мікалаевіч Данілаў, беларускі вучоны-сацыёлаг, член-карэспандэнт НАН Беларусі (1996), доктар сацыялагічных навук (1994), прафесар (1997). У 1980-м скончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут. Аўтар больш чым 200 навуковых прац.

**1995** год — адбыліся выбары ў Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь і рэферэндум па пытаннях мовы (рускай мове былі нададзены роўныя правы з беларускай), новай сімволікі, эканамічнага збліжэння з Расійскай Федэрацыяй і права Прэзідэнта распускаць Вярхоўны Савет.

**2000** год — адкрыты для наведвальнікаў Капыльскі раённы краязнаўчы музей.

У свеце

**1900** год — нарадзіўся Барыс Елісеевіч Жукоўскі, рускі тэатральны педагог, акцёр, прафесар (1944), народны артыст Расіі (1955). З 1923-га — акцёр Ленінградскага акадэмічнага тэатра імя А. С. Пушкіна. У 1934—1937 гадах — мастацкі кіраўнік Беларускай студыі пры Цэнтральным тэатральным вучылішчы ў Ленінградзе. Вёў у студыі заняткі па майстэрстве акцёра. Лаўрэат Сталінскай прэміі (1947, 1951).



**1905** год — нарадзіўся Мікалай Аляксандравіч Ціханаў, савецкі дзяржаўны дзеяч, старшыня Савета Міністраў СССР (1980—1985), двойчы Герой Сацыялістычнай Працы. Лаўрэат Сталінскай прэміі (1943, 1951).

**1955** год — у Варшаве быў падпісаны Дагавор аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе паміж еўрапейскімі краінамі сацыялістычнай садружнасці (Варшаўскі дагавор). Скасаваны 1 ліпеня 1991 года.

**1970** год — нарадзіўся Яраслаў Мікалаевіч Бойка, расійскі акцёр тэатра і кіно.

**1975** год — нарадзіўся Святаслаў Іванавіч Вакарчук, украінскі музыкант, паэт, лідар гурта «Океан Ельзи». Заслужаны артыст Украіны (2005), кандыдат фізіка-матэматычных навук.

Так гаварыў...

**СЕРВАНТЭС:**

*«Бываюць людзі, якім веданне латыні ўсё ж не перашкаджае быць асламі».*

## УСМІХНЕМСЯ

Помнік на адэскіх могілках.

На мармуровай пліце вялізнымі залатымі літарамі выбіта:

«Якаў Майсеевіч Рабіновіч».

А крыху ніжэй — маленькімі літарамі:

«Сваёй жонцы Сары».

**Васільеў гаворыць сваёй жонцы:**

**— Уяўляеш, Галя, гэтаму Мацею ўвесь час шанцуе, увесь час шанцуе, пастаянна шанцуе!**

**У мяне складваецца ўражанне, што ён знайшоў падкову ад... слана!**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.
прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1440.
Нумар падпісаны ў 19.30 13 мая 2020 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12